Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 МАЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 99 (28209) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Новыя формы сацыяльнай абароны**

**СТАР. 3**



**Майская кветка-хамелеон**

**СТАР. 16**



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Дзмітрый КІЙКО, намеснік міністра фінансаў:**

*«Пакуль у рамках удакладнення бюджэту, якое мяркуецца, павелічэнне ставак падаткаў не прадугледжваецца. Усе меры, звязаныя з дадатковай кансалідацыяй, прапанаваныя ўрадам і падтрыманыя Прэзідэнтам, рэалізаваныя. Нагадаю, што было выраашана павялічыць акцызы на аўтамабільнае паліва і тытунёвыя вырабы, адмяніць ільготу па ПДВ на пасажырскія перавозкі, павялічыць стаўку ПДВ на паслугі электрасувязі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19619,00 | ▼ |
| Еўра | 21911,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 300,66 | ▲ |
| Укр. грыўня | 781,63 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НА ПРЫВАЛЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Сталічнае жыллё

## НЕДАРАГІ «КВАДРАТ» У ФАВОРЫ

### На другасным рынку жылля назіраецца павелічэнне попыту ўжо трэці месяц запар



Фота Івана КУПАРВАСА.

**Звычайна ў першыя месяцы вясны жыхары буйных гарадоў краіны пачынаюць больш цікавіцца аб'ектамі нерухомасці. Сёлета патэнцыйныя пакупнікі жылля сапраўды заварушыліся ўжо ў лютым, пасля таго як кватэры істотна патаннелі. Яны таннеюць паціху і цяпер, але сітуацыя на рынку ўжо змянілася.**

НОВАБУДОЎЛІ ТАННЕЙШЫМІ НЕ БУДУЦЬ?..

Тэндэнцыі на рынку новабудоўляў гэтай вясной нагадваюць расстаноўку сіл на другасным рынку жылля, дзе з-за павелічэння актыўнасці пакупнікоў цэны прыпынілі сваё зніжэнне, расказаў **спецыяліст па аналітыцы рынку нерухомасці Андрэй ЧАРНЫШОЎ**. За мінулы месяц зніжэнне цэн на 4% было адзначана толькі ў класе «эканом», але пры блізкім разглядзе такое патанненне тлумачыцца змяненнем структуры прапановы. Справа ў тым, што кватэры, уведзеныя ў эксплуатацыю ў новабудоўлях, ужо былі амаль цалкам распрададзены, а ў продажы засталіся, у асноўным, жылыя памяшканні ў дамах, якія будуюцца. Апошнія, дарэчы, прапанаваліся па больш нізкіх цэнах, чым гатовае жыллё.

**СТАР. 4**

■ Рыхтуемся да свята

## НА ПЛЯЦЫ — «ЖАЛЕЗНЫЯ КОНІ»

### У ваенным парадзе на Дзень Незалежнасці прыме ўдзел каля 200 адзінак баявой тэхнікі

**На полі танкі грукацелі... Гэта не радок з песні. Гэта аэрадром «Ліпкі». Заводзяцца маторы, клубы дыму засцілаюць наваколле: ідзе ваенная тэхніка. Літаральна праз месяц ваенныя машыны выйдуць у парадзе на сталічны праспект. Пакуль — толькі рэпетыцыя.**

Сёлета на парадзе, які адбудзецца 3 ліпеня ў Мінску, будуць задзейнічаны 163 адзінкі баявой тэхнікі. Асядлаюць «жалезных коней» 430 вайскоўцаў. Агульная працягласць механізаванага параднага разліку складзе больш як два кіламетры. Сярэдняя хуткасць тэхнікі — 18 кіламетраў у гадзіну.

— Ужо другі тыдзень мы праводзім трэніроўкі механізаванай калоны параднага разліку, — адзначае **намеснік камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл палкоўнік Уладзімір КУЛАЖЫН**, які адказвае за падрыхтоўку механізаванай калоны да парада. — Адпрацоўваецца зладжанасць парадных разлікаў, вытрымліванне дыстанцыі і хуткасці руху, выраўноўванне ў адну лінію. Гэтыя мерапрыемствы — не толькі падрыхтоўка да парада, яны ў тым ліку павышаюць узровень прафесіяналізму механікаў-кіроўцаў, іншых задзейнічаных у парадзе спецыялістаў.

**СТАР. 2**

# АДСТАВАЦЬ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА

## У наступнай пяцігодцы нашай краіне неабходна застацца ў трэндзе сусветнай эканомікі, навукі і прагрэсу

**Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе па праекце асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016–2020 гады.**

«Стратэгічныя мэты сацыяльна-эканамічнага развіцця на сярэднетэрміновую перспектыву і меры па іх рэалізацыі вызначаны. Тое, што мы абяцалі людзям у перадвыбарчы перыяд, павінна быць безумоўна выканана. Цяпер трэба азначыць далейшыя практычныя крокі, — падкрэсліў беларускі лідар. — У перадвыбарчую кампанію мы вызначаліся, што павінны зрабіць. І наша праграма, літаральна праз год пасля прэзідэнцкіх выбараў, не павінна зведаць кардынальных змен, прынамсі, па асноўных стратэгічных момантах».

Прэзідэнт адзначыў, што Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016–2020 гады будзе галоўным дакументам для абмеркавання на пятым Усебеларускім народным сходзе. «Хацелася б, каб гэта была новая, больш цікавая форма самога дакумента, каб яна насіла жывы характар. Каб гэтая праграма, яе паказчыкі, кожны раздзел былі даступныя не толькі спецыялістам, але і людзям, дзеля якіх мы будзем дасягаць мэт, пастаўленых у гэтай праграме», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«У нас павінны быць рэальныя, але амбіцыйныя мэты. За будучую пяцігодку неабходна не толькі аднавіць страчанае, але пажадана застацца ў трэндзе сусветнай эканомікі, навукі, прагрэсу. Адставаць ні ў якім разе нельга. Мы не павінны адстаць, таму што ў нас ёсць усё для таго, каб прырастаць кожны год. Што для гэтага трэба зрабіць, гэта ў праграме павінна быць вызначана», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, у праграме неабходна дакладна вызначыць шляхі і механізмы рэалізацыі запланаванага. «Калі, дапусцім, лічба па ВУП, то за кошт чаго? Куды будзем прадаваць прадукцыю, у якім аб'ёме?» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы не збіраемся тут займацца нейкім піярам, — падкрэсліў беларускі лідар. — Нам трэба сапраўды вызначыцца, як мы будзем дзейнічаць у будучай пяцігодцы. Нам трэба зарыентаваць грамадства. І гэта будзе адкрытая размова ўлады з прадстаўнікамі народа».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на Усебеларускі народны сход прыедуць дасведчаныя людзі, якія паказалі сябе ў працы і ведаюць, чым жыве грамадства. «Гэта будуць прадстаўнікі нашага народа. І з другога боку — улада. Мы адкрыта і сумленна павінны правесці дыскусію, выпрацаваўшы адпаведныя дакументы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Недахопы ў наяўнасці, іх утойваць не трэба. Народ іх бачыць. Усё, што добрае, мы нагадаем, што створана не толькі за пяцігодку, але за перыяд найноўшай гісторыі. Але галоўнае — гэта выпрацаваць стратэгію на пяцігодку», — дадаў Прэзідэнт.

З асноўным дакладам на нарадзе выступіў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт паставіў перад ім некалькі галоўных пытанняў. У прыватнасці, наколькі напружанымі і дасягальнымі з'яўляюцца мэтавыя ўстаноўкі, прапанаваныя для абмеркавання на Усебеларускім народным сходзе; якія маюцца інструменты для пераадолення дапушчанага ў мінулай пяцігодцы адставання; што варта распачаць для выхаду на ўстойлівую траекторыю эканамічнага росту хаця б на ўзроўні сярэднесусветнага — 2,5-3,5% за год.

«Пры гэтым не трэба даваць залішне песімістычныя ацэнкі, па інерцыі скочваючыся на ўзровень мінулых гадоў. Ніякага песімізму!» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

На нарадзе, якая працягвалася каля трох гадзін, разгарнулася актыўная дыскусія, абмеркаванне было вельмі прадметным і падрабязным. Па сутнасці, унесены Прэзідэнту праект асноўных палажэнняў праграмы развіцця на пяцігоддзе быў кампрамісным дакументам, выпрацаваным з удзелам урада, маніторынгавай групы на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаілам Мясніковічам, іншых дзяржаўных органаў і арганізацый. Па ходзе нарады свае заўвагі і прапановы выказалі кіраўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Камітэта дзяржкантролю, Нацыянальнай акадэміі навук, губернатары. Падрабязна абмеркаваны асноўныя параметры планавання эканомікі. Пры гэтым галоўная мэта пяцігодкі — збалансаванае развіццё краіны.

Прэзідэнт запатрабаваў, каб у канчатковым выглядзе праект праграмы быў канкрэтным і зразумелым для ўсіх планам практычных дзеянняў, адзначыўшы, што «тое, што сёння прапанаваў урад — гэта аснова, на якой далей павінна быць пабудавана праграма, выпрацаваная сумесна». На дапрацоўку праекта адведзена 10 дзён.

■ Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ ЗАЦІКАЎЛЕНЫ ВА ЎМАЦАВАННІ АДНОСІН З ГРУЗІЯЙ

**Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктар Гумінскі прымае ўдзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, прымеркаваных да 25-годдзя незалежнасці Грузіі. Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты, у рамках праграмы візіту ў Тбілісі адбылася двухбаковая сустрэча віцэ-спікера Палаты прадстаўнікоў са старшынёй парламента Грузіі Давідам Усупашвілі.**

Падчас сустрэчы Віктар Гумінскі адзначыў, што сумеснымі намаганнямі беларускія і грузінскія парламентарыі «могуць аказаць значнае садзейнічанне пашырэнню двухбаковых гандлёва-эканамічных, інвестыцыйных, навукова-тэхнічных і культурных сувязяў». Як гаворыцца ў прэс-паведамленні, бакі сышліся на тым, што неабходна, каб парламентарыі дзвюх краін больш актыўна садзейнічалі рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых падчас абмену візітамі на найвышэйшым і высокім узроўнях.

Віктар Гумінскі таксама сустрэўся і з кіраўніком парламенцкай групы дружбы «Грузія — Рэспубліка Беларусь» Аляксандрам Кантарыем. «Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў выказаў зацікаўленне дыялогам паміж групамі дружбы, а таксама падкрэсліў, што практыка правядзення рэгулярных сустрэч на ўзроўні парламенцкіх груп стварае дадатковыя ўмовы для развіцця ўсяго комплексу двухбаковых адносін паміж Беларуссю і Грузіяй», — паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# БЛІЖЭЙ ДА МІРУ

## МЗС нашай краіны станоўча ацэньвае вызваленне ўкраінскай лётчыцы

**Беларусь вітае той факт, што Расійская Федэрацыя і Украіна знялі з парадку дня адно з пытанняў. Пра гэта падчас чарговага брыфінгу заявіў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Дзмітрый МІРОНЧЫК, адказваючы на пытанне журналісткі наконт вызвалення ўкраінскай лётчыцы Надзеі Саўчанкі.**

### Адным пытаннем менш

Па словах дыпламата, гэта пытанне «на працягу доўгага часу з'яўлялася перашкодай для прадметнага абмеркавання шляхоў рэалізацыі мінскіх пагадненняў і прасоўвання па шляху мірнага ўрэгулявання на ўсходзе Украіны». Ён таксама выказаў спадзяванні, што гэта падзея «пазітыўна адаб'ецца на ўсім перагаворным працэсе».

— Беларускі бок будзе максімальна садзейнічаць далейшай працы трохбаковай кантактнай групы і рабочых падгруп, забяспечыць усе неабходныя ўмовы для працягу мінскага працэсу, каб у наш рэгіён як мага хутчэй вярнуўся мір, — сказаў прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства.

### Ва ўласнай бяспецы мы самі зацікаўлены

Дзмітрый Міронычк таксама больш падрабязна расказаў пра нядаўнюю сустрэчу Уладзіміра Макея, міністра замежных спраў, з віцэ-прэзідэнтам Еўрапейскай камісіі па энергетычным саюзе Марашам Шаўчовічам.

— На гэтай сустрэчы размова ішла аб энергетычным дыялогу Рэспублікі Беларусь і Еўрапейскага саюза, аб энергетычнай бяспецы ў рэгіёне ў цэлым і ў Беларусі ў прыватнасці, — паведаміў прэс-сакратар МЗС. — Натуральна, закранался пытанне аб будаўніцтве Беларускай атамнай электрастанцыі ў Астраўцы. Мы цесна працуем з міжнароднымі арганізацыямі, з усімі без выключэння, хто займаецца гэтым пытаннем. Гэта і Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі, гэта і Сусветная асацыяцыя аператараў АЭС, а таксама, натуральна, Еўрапейская камісія і іншыя партнёры. Маем намер падобным чынам дзейнічаць і надалей.

Што да чарговага каментарыя літоўскага міністэрства замежных спраў наконт бяспекі на Астравецкай АЭС, то Дзмітрый Міронычк падкрэсліў:

— Літоўскі бок фактычна займаецца тым, што публічна заклікае нас зрабіць крокі, якія мы і без гэтага рабілі, робім і будзем рабіць. Прычым, падкрэслю, мы гэта робім па ўласнай ініцыятыве, таму што сама Беларусь, як ніхто іншы, зацікаўлена ў бяспецы будучай станцыі і ў яе адпаведнасці міжнародным стандартам.

### Консульствы ў сацыяльных сетках

Прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства праінфармаваў пра 23-е пасяджэнне Кансультатыўнага савета консульскіх службаў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Мерапрыемства прайшло ўчора ў Бішкеку, сталіцы Кыргызстана, які сёлета старшынствуе ў СНД.

Як паведамляецца, на пасяджэнні абмяркоўваліся пытанні абароны інтарэсаў грамадзян на тэрыторыі дзяржаў — удзельніц СНД. Удзельнікі мерапрыемства абмяняліся вопытам па эвакуацыі людзей з «гарачых кропак», у выпадку стыхійных бедстваў, надзвычайных сітуацый, тэрарыстычных актаў і іншых крызісных з'яў. Таксама абмяркоўвалася і выкарыстанне сацыяльных сетак у консульскай дзейнасці.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# МОЛАДЗЬ ІМКНЕЦЦА ПРАЦАВАЦЬ



**— Гэта вялікі гонар, што мяне выбралі дэлегатам на Усебеларускі народны сход ад моладзі Гомельшчыны, — падкрэслівае першы сакратар Гомельскай абласной арганізацыі БРСМ Ігар ЗАВАЛЕЙ.**

— Быць удзельнікам Усебеларускага сходу не толькі ганарова, але і адказна, — гаворыць ён. — Кіраўніцтвам краіны будуць агучаны задачы развіцця Беларусі на бліжэйшыя пяць гадоў. Сёння ў нашай дзяржаве шмат увагі ўдзяляецца моладзі і я, як прадстаўнік маладзёжнай грамадскай арганізацыі, у ліку першых даведаюся пра мэты, якія будуць пастаўлены ў тым ліку перад падрастаючым пакаленнем. Гэта стане асновай у нашай рабоце па рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Гомельскай вобласці. Нам, дэлегатам, трэба будзе данесці ўсе пасылы сходу нашай моладзі.

Адным з асноўных кірункаў дзейнасці нашай арганізацыі з'яўляецца працаўладкаванне моладзі. Мы надаём гэтай праблеме вельмі многа ўвагі. Летась на Гомельшчыне мы дапамаглі працаўладкавацца больш чым 15 тысячам маладых людзей. Праца з'яўляецца адным з самых лепшых спосабаў выхавання. Таму з дапамогай працаўладкавання мы імкнёмся выхоўваць годных грамадзян Рэспублікі Беларусь. Мы будзем і надалей стымуляваць працадаўцаў даваць цікавую і добра аплачваемую работу маладым людзям.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

# НА ПЛЯЦЫ — «ЖАЛЕЗНЫЯ КОНІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ужо сёння, улічваючы прафесійналы паказчык, маральную падрыхтаванасць, асабовы склад гатовы да выканання задачы па правядзенні парада войскаў Мінскага гарнізона.

Трэба адзначыць, што на Дзень Незалежнасці на мінскі праспект выйдзе тэхніка, якая прымае непасрэдны ўдзел у баявой падрыхтоўцы Узброеных Сіл. За выключэннем, вядома, рарытэтаў. Менавіта рэтратэхніка перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага часу адкрые парад механізаваңай калоны. Права прайсці першым па традыцыі будзе прадастаўлена легендарнаму танку Т-34 — як сімвалу Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.



Фота БЕЛТА.

Каб паўдзельнічаць у парадзе, у Мінск прыехалі вайскоўцы з розных воінскіх часцей і злучэнняў Беларусі. Для большасці з іх — гэта першы парад. Таму вельмі хвалююча і адказна.

— Сёлета ў парадзе войскаў Мінскага гарнізона наша воінскае падраздзяленне прадстаўляюць машыны БТР-80 у колькасці 16 адзінак, — расказвае **старшы афіцэр бранятанкавай службы 38-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Аляксей КРАЎЧУК**. — Адпаведна ў іх упраўленні задзейнічана 16 кіроўцаў, старшыня на машынах і стралкі-зенітчыкі. Асабовы склад зацікаўлены ў тым, каб з годнасцю прадставіць брыгаду, сілы спецыяльных аперацый, прадэманстраваць свае навыкі і ўменні.

Як перакананы **старшы механік-кіроўца БМП-2 120-й асобнай механізаванай брыгады Сяргей МОГУТАЎ**, удзел у парадзе — гэта вялікі гонар для кожнага салдата. Для хлопца гэты дзень будзе адказным і хвалюючым удвайне: у Мінск з Гомеля прыедуць яго бацькі, каб убачыць сына-абаронцу не па тэлевізары.

У прамежках паміж трэніроўкамі вайскоўцам сумаваць не даводзіцца. На выхадных для іх арганізаваны шматлікія мерапрыемствы. Асабліва гэта карысна для тых, хто прыехаў у Мінск з аддаленых рэгіёнаў. Як лічыць **гвардыі радавы Дзмітрый МАЗУЛЕНЯ**, які служыць у 38-й мабільнай брыгадзе ў Брэсце, удзел у парадзе — гэта не толькі ўдасканаленне прафесійнага майстэрства, а і выдатнае знаёмства са сталіцай, гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі краіны. Салдаты тэрміновай службы ўжо пабывалі ў мемарыяльным комплексе «Хатынь», у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дзяржаўным музеі ваеннай гісторыі. І на гэтым іх знаёмства з гісторыяй нашай краіны не скончана.

Напярэдадні — рэпетыцыі пешай і паветранай калон, якія таксама ўпрыгожаць сёлетні парад. Якія цікавінкі падрыхтавалі арганізатары, раскажам у наступных нумарах «Звязды».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Актуальна

# ДАПАМОЖА СТРАХОЎКА АД БЕСПРАЦОЎЯ?

## ФПБ ініцыіруе ўвядзенне новых форм сацыяльнай абароны

**Як можна падтрымаць чалавека, што стаў беспрацоўным? Як стварыць умовы для таго, каб ён мог захаваць звыклы ўзровень жыцця на той перыяд, калі шукае новую работу? Рашэннем гэтага пытання і можа стаць страхаванне па беспрацоўі.**

Калі браць сусветную практыку, то сёння каля 72 краін выкарыстоўваюць сістэму страхавання па беспрацоўі (па звестках Міжнароднай арганізацыі працы). Яе мэта простая: у выпадку страты работы чалавек павінен мець на нейкі час «падушку бяспекі». Гэта значыць вас звольнілі, але пры гэтым вы будзеце штомесяц атрымліваць суму, не намнога меншую за вашу зарплату.

Як сведчыць сусветны вопыт, каб атрымаць гэтую дапамогу, неабходна выкананне некалькіх умоў. У першую чаргу ацэньваецца папярэдні досвед працы, яго працягласць, а таксама ці адбывалася выплата страхавых унёскаў. Акрамя таго, чалавек павінен мець афіцыйны статус беспрацоўнага і актыўна шукаць новае месца для працаўладкавання. Яшчэ адзін момант: той, хто звольніўся па ўласным жаданні, правы на такую дапамогу можа і не мець.

У большасці краін памер выплачваемай дапамогі вызначаецца ўзроўнем сярэдняга заробку, які быў да таго, як чалавек стаў беспрацоўным. Перыяд, за які разлічваецца сярэдні заробак, можа складаць год (Францыя, Чылі), 5-6 месяцаў (Канада, Аргенціна, Японія), 3 месяцы (Манголія, Данія) ці нават 1 месяц (Бельгія).

Пачатковая стаўка кампенсацыі таксама вар'іруецца. У большасці краін яна складае каля 50% ад папярэдняга заробку (Аргенціна, Карэя, Эстонія, ЗША), аднак можа быць і вышэй (Германія, Францыя), нават дасягаць 90% (Данія). Пры гэтым многія краіны выкарыстоўваюць паніжальную з часам стаўку кампенсацыі (Аргенціна, Чылі, Швецыя, Эстонія).

Мінімальны перыяд выплаты ў некаторых краінах складае толькі 3 месяцы (Бразілія, Манголія, Канада), у іншых выплаты праводзяцца як мінімум 6 месяцаў (Германія, Італія), а ў некаторых не менш за 1-2 гады (Данія, Швецыя). Максімальны перыяд выплат зноў жа адрозніваецца: ад 3-5 месяцаў (Манголія, Чэхія) да 3 гадоў (Партугалія).

24 мая па ініцыятыве Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі адбыўся «круглы стол» па абмеркаванні перспектыў укаранення новых відаў сацыяльнага страхавання — страхавання па беспрацоўі і страхавання на выпадак страты заробку з прычыны неплацежаздольнасці (банкруцтва) наймальніка. У ім узялі ўдзел міжнародныя эксперты, прадстаўнікі міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, эканомікі, фінансаў, Генеральнай пракуратуры, Нацыянальнай акадэміі навук, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Па выніках работы «круглага стала» будуць выпрацаваны прапановы, якія прафсаюзы накіруюць ва ўрад, а таксама ў план падрыхтоўкі законапраектаў на 2017 год. Таксама вынікі работы круглага стала будуць разгледжаны на адным з маючых адбыцца пасяджэнняў Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях.

* * *

У прыватнасці, у бліжэйшай нашай суседкі — Латвіі дапамога па беспрацоўі разлічваецца ў залежнасці ад працягласці страхавога стажу. Як паведаміла **дырэктар Дэпартамента сацыяльнага страхавання Міністэрства дабрабыту Латвіі Яна МУЖНІЕЦЭ**, калі страхавы стаж меншы за 9 гадоў, дапамога вызначаецца ў памеры 50% ад сярэдняй зарплаты, калі ён складае 10-19 гадоў — 55%, 20-29 гадоў — 60%, звыш 30 гадоў — 65% сярэдняй зарплаты. Сума выплат ажыццяўляецца з разліку сярэдняга заробку за папярэднія 12 месяцаў. Пры гэтым сістэма выплаты дапамогі па беспрацоўі мае абмежаванні па працягласці, што павінна стымуляваць чалавека на актыўны пошук працы.

**Начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН** адзначае: «На маю асабістую думку — гэта прагрэсіўная сістэма. Мы вывучаем сітуацыю і ў канцы года плануем даць прапановы ўраду па гэтай тэме. Але, вядома, галоўнае пытанне: хто будзе плаціць страхавыя ўнёскі і ў якім памеры? Наўрад ці ў нас атрымаецца пабудаваць сістэму абароны ад беспрацоўя, якая будзе рэальна функцыянаваць без дапамогі працадаўцаў і работнікаў.

**• Дарэчы**

Колькасць зарэгістраваных беспрацоўных на 1 красавіка 2016 года — 53,5 тысячы чалавек.

Укараненне механізму страхавання па беспрацоўі і павелічэнне дапамогі па беспрацоўі да ўзроўню бюджэту пражытковага мінімуму прадугледжваецца праектам Дзяржаўнай праграмы садзейнічання занятасці і сацыяльнай абароны на 2016–2020 гады.

Асноўныя прынцыпы страхавання ад беспрацоўя — трохканальная сістэма фінансавання страхавых фондаў (работнікі, працадаўцы, дзяржава), значная ступень цэнтралізацыі страхавых фондаў, высокі ўзровень сацыяльнай абароны і страхавых дапамог.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

■ Цяжкая прамысловасць

# ПРАЦЯГВАЕМ ЗАВАЁЎВАЦЬ РЫНКІ




**Беларускія «цяжкавагавікі» ўсё далей пранікаюць на замежныя рынкі — дзякуючы сваёй якасці і ўнікальнасці. Тэхнікай Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў актыўна цікавяцца на буйных міжнародных выставах. Кампанія ажыццяўляе перспектыўныя праекты па зборцы трактароў на новых сумесных прадпрыемствах. А машыны кампаніі «БелАЗ» пастаўляе машыны ў краіны далёкай дугі.**

### Сербы выбіраюць беларускае

У Сербіі на 83-й міжнароднай сельскагаспадарчай выставе, якая з'яўляецца найбуйнейшым аграпрамысловым форумам у краінах Балканскага паўвострава, былі прадстаўлены трактары вытворчасці Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў. Цэнтральны стэнд на тэрыторыі выстаўкі займала кампанія «Беларус-Аграпанонка», якая прадстаўляе ў Сербіі і іншых краінах былой Югаславіі трактары маркі «Беларус». Сербскім аграрыям прадэманстравалі трактары «Беларус-422» і «Беларус-622». За першыя два дні стэнд з беларускай тэхнікай наведалі больш за 40 тысяч удзельнікаў. Таксама кампанія заключыла кантракты на продаж 15 трактароў.

Акрамя таго, чацвёртую партыю трактароў маркі бабруйскага завода сабралі на новай сумеснай зборачнай вытворчасці ў аўтаномнай тэрыторыі Гагаузіі, што знаходзіцца на тэрыторыі Малдовы. Яе адкрыццё сумесна з кампаніяй Batstractor стала вынікам правядзення ў Гагаузскай аўтаноміі ў лістападзе 2015 года інвестыцыйнага форуму Gagauzinvest. У перспектыве плануецца рэалізоўваць беларускую тэхніку ў суседніх краінах. Перавага зборкі трактароў у Гагаузіі заключаецца ў тым, што кампанія Batstractor можа прадаваць тэхніку малдаўскім пакупнікам па заводскай цане, а гэта значна павышае іх канкурэнтаздольнасць.

### Неабходныя ў Афрыцы

Паводле інфармацыі прэс-службы Міністэрства прамысловасці Беларусі, спецыялісты кампаніі «БелАЗ» завяршылі мантаж і зборку машыны БелАЗ-76135 у Каралеўстве Марока. Гэта не першая пастаўка спецтэхнікі маркі БелАЗ для дзяржаўнай фасфатаздабываючай кампаніі гэтай краіны OCP, дзе ўжо працуюць бульдозеры БелАЗ-78231.

Машына БелАЗ-76135 зроблена на базе кар'ернага самазвала «БелАЗ» грузападымальнасцю 110-136 т. Гэтая тэхніка прызначана для правядзення работ у кар'ерах адкрытых распрацовак карысных выкапняў. У залежнасці ад умоў эксплуатацыі можа пастаўляцца ў рознай камплектацыі. У ходзе выпрабаванняў і дэманстрацыі магчымасцяў машыны прадстаўнікі эксплуатуючай кампаніі OCP высока яе ацанілі і маюць намер працягнуць узаемавыгаднае супрацоўніцтва па набыцці спецтэхнікі і кар'ерных самазвалаў Беларускага аўтамабільнага завода.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ПРЫПЯЧЭ І ЗАЛЬЕ

## У выхадныя нават уначы будзе да 16 цяпла, а ўдзень чакаецца і ўвогуле да плюс 28 градусаў

**Даволі цёплае надвор'е, але з навальніцамі, чакаецца ў нашай краіне напрыканцы гэтага тыдня, паведамляюць сіноптыкі Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць цёплая, але няўстойлівая паветраная маса. Удзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Вецер будзе няўстойлівы слабы, пры навальніцах парывісты. Максімальная тэмпература паветра будзе дасягаць плюс 20–25 градусаў, а па Брэсцкай і Гомельскай абласцях паветра прагрэецца нават да 27 цяпла.

І ў выхадныя на тэрыторыю краіны працягнуць паступаць цёплыя, але больш вільготныя паветраныя масы з поўдня Еўропы. Уначы дажджоў будзе па мінімуме, а вось удзень за кошт развіцця канвектыўнай воблачнасці ападкаў стане больш, пры гэтым яны будуць суправаджацца навальніцамі, а месцамі — і з парывістым ветрам. У суботу ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 8 да 14 цяпла, удзень чакаецца да плюс 21 градуса па поўначы і да плюс 28 градусаў па поўдні краіны. Таксама кароткачасовыя дажджы з навальніцамі прагназуюцца амаль паўсюдна і ў нядзелю.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня будзе па-ранейшаму цёпла і дажджліва. У панядзелак і аўторак уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя ападкі. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—17 цяпла, а ўдзень прагназуецца ад 21 да 27 градусаў, месцамі ў цэнтральнай частцы краіны і на поўдні — да 29 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# КАЛІ СПОРТ І МАСТАЦТВА ПОБАЧ

## У краіне падвялі вынікі самага творчага конкурсу ў спартыўнай сферы

**На працягу шасці месяцаў па ўсіх рэгіёнах Беларусі праходзіў сапраўдны марафон. Ужо каторы год рэспубліканскі конкурс дзіцячага малюнка «Пасябраваць са спортам» збірае больш за дзвесце дзяўчатак і хлопчыкаў, якія прадстаўляюць свае работы, прысвечаныя любімым відам спорту, беларускім атлетам і нашым агульным перамогам.**

У топе як самыя папулярныя віды (футбол і хакей), так і экзотыка — кёрлінг. Героямі малюнкаў станавіліся не толькі самі дзеці і іх бацькі, але і нашы славутыя чэмпіёны — Дар'я Домрачава, Ала Цупер, Іна Жукава. Менавіта гэтыя спартсмены, дарэчы, сталі часткай журы і выбіралі найбольш цікавыя работы. Многія школьнікі прымалі ўдзел у конкурсе ўжо не першы раз. Арганізатары адзначаюць, што сёлетняе мерапрыемства адрозніваецца сваёй масавасцю: суіскальнікамі ўзнагарод сталі практычна 290 дзяцей з 3 тысяч школ.


Фота БЕЛТА.

Прызёры ў старэйшай узроставай групе Аляксей НІКІЦІЧ, Ганна ГРУЖЭЎСКАЯ і Анастасія СКОБЕЛЕВА.

Самыя маляўнічыя і арыгінальныя работы (70 найлепшых) дайшлі да фіналу, а іх аўтары атрымалі прызы ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба (арганізатара і заснавальніка конкурсу). Пераможцам у малодшай групе стаў Арцём Сайкоў з Магілёва (малюнак «Любімае хобі»), а першай сярод вучняў 4-6 класаў аказалася Ганна Гружэўская з Ашмян (малюнак «Біятланісты»).

Акрамя сувеніраў, усе 70 дзяцей атрымалі пуцёўкі ў піянерскі лагер. Дарэчы, найлепшыя работы жыхары і госці сталіцы ў хуткім часе ўбачаць на мінскіх білбордах.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ На слыху

# ВЫСНОВЫ З ТРАГІЧНАГА ЎРОКА

**Міністэрства адукацыі працуе над комплексам дадатковых мер бяспекі ў школах. Пра гэта паведаміла журналістам прэс-сакратар міністэрства Юлія БАРАДУН, адказваючы на пытанне з нагоды нядаўняга нападу вучня 74-й сталічнай гімназіі на настаўніцу.**

«Мы плануем ва ўзаемадзеянні з іншымі ведамствамі, у тым ліку з Міністэрствам унутраных спраў, дадаткова прапрацаваць меры бяспекі. Як толькі план будзе гатовы, а я думаю, што гэта адбудзецца ў найбліжэйшы час, мы абавязкова прадставім яго грамадскасці», — паабяцала прэс-сакратар. Як паведамлялася раней, 23 мая ўпраўленне Следчага камітэта па Мінску завяло крымінальную справу па ч.1 арт.14 і ч.1 арт.139 КК (замах на забойства). Ці будзе выплачана настаўніцы, якая пацярпела на працоўным месцы, кампенсацыя?

— Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама вынесе пастанову па гэтым выпадку, — дадала Юлія Барадун.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# НЕДАРАГІ «КВАДРАТ» У ФАВОРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Апошнім часам працягвае расці нежаданне пакупнікоў набываць кватэры на пачатковым этапе будаўніцтва. А ў выніку для прыцягнення пакупнікоў у дамах на стадыі катлавана забудоўшчыкі вымушаны зніжаць цэны.

Акрамя таго, важкая доля новабудоўляў класа «эканом» належыць дзяржаўным забудоўшчыкам, якія атрымліваюць участкі пад забудову на льготных умовах. У выніку чаго кошт квадратнага метра ў такіх дамах, як правіла, ніжэйшы з-за адсутнасці выдаткаў на знос і адсяленне. Эксперты падлічылі, што, паводле вынікаў красавіка, сярэдняя цана квадратнага метра ў новабудоўлях склалася па дамах класа якасці «эканом» у памеры 1010 долараў, класа «стандарт» — 1160, а класа «камфорт» і «прэстыж» — 1280 і 1780 долараў за квадратны метр адпаведна.

Рост попыту і на першасным рынку жылля адзначаецца ўжо другі месяц запар, кажуць спецыялісты. Сёлетні красавік паказвае, што гэтай вясной колькасць заявак на набыццё жылля перавысіла сярэдні ўзровень 2015 года на 10%. Высокі ўзровень попыту дазволіў забудоўшчыкам паменшыць колькасць маркетынгавых акцый, якія праводзяцца для стымуляцыі продажаў.

У разрэзе класаў якасці найбольш папулярныя сярод пакупнікоў застаюцца «эканом» і «стандарт»: 80% здзейсненых здзелак з новабудоўлямі прыпадае менавіта на жыллё ў дамах гэтых класаў. У той жа час на новабудоўлі класа «камфорт» і «прэстыж», якія ўтрымліваюць цэны на больш высокім узроўні, попыт застаецца невысокім.

Варта адзначыць, што тыя забудоўшчыкі, хто своечасова ішоў на зніжэнне цэн у адпаведнасці з рынкавымі тэндэнцыямі, не адчувалі «прасядання» попыту нават у крызісны перыяд, а нерэалізаванымі заставаліся толькі тыя новабудоўлі, у якіх цэны першапачаткова былі завышаныя. У прыватнасці, «даплата за ўдалае месцазнаходжанне» дома пакупнікамі ўжо не прымаецца, як і кватэры вялікай плошчы або так званыя «пентхаусы». Нават у папулярных на рынку дамах падобныя кватэры застаюцца без гаспадароў.

## ...НЕМАЛАДОЕ ЖЫЛЛЁ — ТАКСАМА?

Патэнцыйныя гаспадары гатовага жылля пачалі больш цікавіцца жыллёвай нерухомасцю ўжо ў лютым (плюс 9% да студзеня). У сакавіку попыт павялічыўся яшчэ на 18%, а ў красавіку — адразу на 25%. Атрымліваецца, што толькі за апошнія тры месяцы на другасным рынку жылля актыўнасць пакупнікоў узрасла больш чым на 60%. А гэта адбілася як на цэнах, так і на аб'ёме і структуры рыначнай прапановы.

Эксперты рынку адзначаюць, што ўжо ў першай дэкадзе мая істотна замарудзіліся тэмпы зніжэння цэн. Сярэдні цэннік на кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў у параўнанні з сакавіком знізіліся толькі на 1%, у той час як гэты паказчык у сакавіку ў параўнанні з лютым складаў каля 5%.

### Дынаміка змены сярэдніх цэн на кватэры другаснага рынку




Такім чынам, цяпер сярэдняя цана квадратнага метра стандартных кватэр па выніках красавіка склала 1 070 долараў для аднапакаёвых, 995 долараў — для двухпакаёвых і 950 долараў за «квадрат» для трохпакаёвых кватэр.

Па цэнах кватэры са свежым рамонтам і мэбляй (гатовыя да пражывання) ушчыльную наблізіліся да стандартных пустых жылых памяшканняў, што звычайна прапануюцца на продаж. Даплата за свежы рамонт і мэблю цяпер складае ў сярэднім каля 6,5 тысячы долараў па аднапакаёвай, парадку 7,5 тысячы па двухпакаёвай і прыкладна 13,5 тысячы долараў у выпадку з трохпакаёвай кватэрай. Нагадаю, што летась падобны бонус у выглядзе рамонту і мэблі ацэньваўся прадаўцамі прыкладна на 3-5 тысяч долараў даражэй.

Цяпер стандартныя аднапакаёвыя кватэры агульнай плошчай 33 квадратныя метры прапануюцца ўжо ў большасці выпадках па 35 тысяч долараў, двухпакаёвыя кватэры з плошчай 50 «квадратаў» — за 50 тысяч, а трохпакаёвыя (68 кв. м) — за 64 тысячы долараў.

Спецыялісты сферы жыллёвай нерухомасці цяпер адзначаюць, што пакупніцкая актыўнасць адбілася і на сярэднім тэрміне знаходжання кватэр на рынку. Найбольш цікавыя па суадносінах фактараў «кошт-стан (гатоўнасць да пражывання)» кватэры вымываюцца з рынку літаральна за некалькі тыдняў. У выніку чаго на працягу красавіка колькасць прапанаваных на продаж аб'ектаў знізілася на 11%.

Аналітыкі буйных сталічных агенцтваў нерухомасці адзначаюць, што попыт пакупнікоў сканцэнтраваны на кватэрах стандартных спажывецкіх якасцяў, якія не патрабуюць правядзення дарагога рамонту. Збольшага гэта абумоўлена тым, што значная частка новых гаспадароў разлічвае зрабіць рамонт сваімі рукамі, без прыцягнення спецыялістаў. Другім варыянтам стабільнага попыту ў пакупнікоў сталі жылыя памяшканні па рэальных цэнах, але гатовыя да пражывання, дзе ўвогуле не трэба рабіць рамонт.

Разам з тым кватэры, якія патрабуюць значных фінансавых укладанняў, як і большасць «элітнага» жылля, застаюцца доўгі час на рынку незапатрабаванымі. Для падобных варыянтаў чакаецца «асаблівы» пакупнік.

Сярэдні тэрмін экспазіцыі кватэры, на падставе аналізу размешчаных прадаўцамі аб'яў, складае 2-3 месяцы. Прычына такога доўгага тэрміну не толькі ў шырокім выбары, але і ў многіх выпадках у завышанай пачатковай цане кватэры, а таксама ў пасіўнасці прадаўца пры пошуку пакупніка. Тактыка чакання водгуку ад пакупнікоў у адказ на размешчаную аб'яву сёння не працуе.

У той жа час практыка агенцтваў нерухомасці паказвае, што тэрмін продажу кватэры можа быць зніжаны да 30 дзён за кошт актыўнай прапановы аб'екта патэнцыйным пакупнікам (у тым ліку і ў рамках альтэрнатыўных здзелак), а таксама першапачатковага ўстанаўлення рыначнага кошту кватэры. Аналіз праведзеных сёлета здзелак сведчыць аб тым, што надбаўка на торг не павінна перавышаць 5-8% ад рыначнага цэнніка (чаканага кошту здзелкі) кватэры, інакш узнікае вялікая верагоднасць таго, што аб'ект будзе ігнаравацца патэнцыйнымі пакупнікамі ўвогуле. Вялікі аб'ём прапановы кватэр на рынку прадастаўляе пакупнікам, з аднаго боку, шырыню выбару, а з другога, такая разнастайнасць выбару прыводзіць пакупнікоў да разгубленасці.

Бываюць выпадкі, калі падобная разгубленасць прыводзіць да страты часу і нерваў. Напрыклад, пры выбары жылля часам пакупнікі праглядаюць 10-15, а то і больш кватэр, бо спадзяюцца знайсці ідэальны варыянт па максімальна нізкай цане. Але часта пошукі зацягваюцца, і да моманту прыняцця канчатковага рашэння вылучаныя аб'екты аказваюцца прададзенымі іншаму кліенту.

## ПАРАДЫ ЭКСПЕРТАЎ

У гэтай сітуацыі спецыялісты сталічнага рынку нерухомасці рэкамендуюць пакупнікам уважліва ацэньваць кожны варыянт, таму што «заўтра» той кватэры, якая вам падыходзіць, ужо можа і не быць.

Акрамя таго, параўноўваючы выбраныя варыянты, неабходна звяртаць увагу на розніцу ў кошце паміж стандартнымі кватэрамі і аналагічнымі, але гатовымі да пражывання. Цалкам магчыма, што апошнія ў выніку абыдуцца вам нават танней за кошт адсутнасці неабходнасці ў правядзенні рамонту і набыцця мэблі.

## ЦЭНАВАЕ «ДНО» ДАСЯГНЕЦЦА ЛЕТАМ

Нягледзячы на тое, што ўжо цяпер актыўнасць пакупнікоў істотна змяніла сітуацыю на рынку, казаць аб змяненні тэндэнцый пакуль зарана. Цэны на жыллё яшчэ не стабілізаваліся, бо пакупнікі актыўна шукаюць менавіта танныя кватэры. А ў каталогу прапановы каля 60% аб'ектаў маюць завышаныя цэннікі.

У гэтым выпадку эксперты амаль упэўнены, што мінімальныя кошты на стандартнае гарадское жыллё трэба чакаць у Мінску ў ліпені і першай палове жніўня. Асобныя эксперты прагназуюць, што ў гэты перыяд невялікія аднапакаёвыя кватэры будуць масава прапанавацца па кошце да 30 тысяч долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

**• Дарэчы**

### Кліентам АН «Акадэмічнае» і «Бізнес Нерухомасць» да ўвагі

**Міністэрства юстыцыі Беларусі рэкамендуе кліентам агенцтваў нерухомасці, якія былі пазбаўлены ліцэнзій, не адкладваць і скасоўваць дагаворы на аказанне рыэлтарскіх паслуг, паведамляе прэс-служба Мінюста.**

У прыватнасці, у Мінюсце ўдакладняюць, што, «згодна з заканадаўствам, пры ўзнікненні абставін, якія забараняюць агенцтвам нерухомасці ажыццяўляць рыэлтарскую дзейнасць, рыэлтарам у абавязковым парадку неабходна пісьмова паведамляць пра гэта сваім кліентам. Больш за тое, падобную працэдуру структура без ліцэнзіі павінны ажыццявіць на працягу трох дзён з моманту, як рыэлтарская арганізацыя даведалася пра абставіны, пры якіх яна не мае права працаваць».

У Мінюсце нагадалі, што ў сувязі са спыненнем 30 красавіка дзеяння ліцэнзій, выдадзеных агенцтвам нерухомасці «Акадэмічнае» і «Бізнес Нерухомасць», грамадзянам неабходна неадкладна звяртацца ў гэтыя арганізацыі для скасавання дагавораў на аказанне рыэлтарскіх паслуг.



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1.** Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 240/С-28863, расположенное по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Мира, д. 39А, площадь – 5,688 кв.м, назначение – административно-инженерный корпус. Начальная стоимость лота – 12.232.716 белорусских рублей. (Залог ОАО «Белгазпромбанк»). |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Оршанский инструментальный завод», УНП 300207906, юридический адрес: Витебская область, г. Орша, ул. Мира, 39А |
| **Местонахождение имущества** | г. Орша, ул. Мира, 39А<br>Контактные лица по вопросам осмотра имущества и получения дополнительной информации:<br>Бегляк Александр Сергеевич: т.р. 8 0216 21 64 43, т.м. +37529 365 46 42;<br>Степанова Татьяна Владимировна: 80216 21 68 81, т.м. +37529 219 22 47 |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Белгазпромбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, 10/1<br>27 июня 2016 года в 14.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210015, г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.5<br>Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна, тел. (0212) 62 03 40, т.м. 375-33-687-91-63<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 24 июня 2016 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62**

| |
|---|
| **Продавец: Открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, 8 (0212) 57-85-08.** |
| Лот №1. Бильярдный стол «Магнат» 12 (инв. №08610006). Нач. цена: 39 700 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 970 000 бел. руб. |
| Аукцион состоится **29.06.2016 в 11.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 27.05.2016 с 8.30 по 28.06.2016 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества в размере 974 000 бел. руб., оплата НДС сверх цены продажи объекта. Имущество расположено по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 34/2. |

| |
|---|
| **Продавец: Открытое акционерное общество «Доломит», Витебская обл., г. Витебск, г/п Руба, ул. Центральная, 23, 8 (0212) 57-85-08.** |
| Лот №1. Изолированное помещение с инв. №200/D-176885 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-1, площадью 15,8 кв.м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена: 5 642 730 бел. руб. без НДС. Задаток: 564 000 бел. руб. |
| Лот №2. Изолированное помещение с инв. № 200/D-176887 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-2, площадью 16 кв.м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена: 5 715 070 бел. руб. без НДС. Задаток: 571 000 бел. руб. |
| Лот №3. Изолированное помещение с инв. № 200/D-176888 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-3, площадью 15,4 кв.м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена: 5 500 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 550 000 бел. руб. |
| Лот №4. Изолированное помещение с инв. № 200/D-176889 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-4, площадью 14,4 кв.м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена: 5 142 200 бел. руб. без НДС. Задаток: 514 000 бел. руб. |
| Лот №5. Капитальное строение с инв. № 200/С-51431, площадью 53,7 кв.м, назначение, наименование – здание неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г/п Руба, ул. Центральная, д. 23а, на зем. участке площадью 0,0316 га. Нач. цена: 70 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 7 000 000 бел. руб. |
| Лот №6. Капитальное строение с инв. № 200/С-96175, общая площадь застройки 1768 кв.м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – силосный склад цеха №2, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 25/31, на зем. участке площадью 41,6313 га (долевая аренда). Нач. цена: 1 015 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 101 500 000 бел. руб. |
| Аукцион состоится **29.06.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 27.05.2016 с 8.30 по 28.06.2016 до 17.30.** Срок подписания договора купли-продажи: 5 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. |

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. **Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан**: перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, **тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Юрый ЯРОШЫК:

# «САМАЕ ЦІКАВАЕ Ў МАЁЙ ПРАЦЫ — ГІСТОРЫІ ІНШЫХ ЛЮДЗЕЙ»

**Упершыню нагодай для знаёмства з гэтым маладым рэжысёрам Белтэлерадыёкампаніі стаў яго праект «Раскадроўка», які пэўны час ішоў у эфіры «Беларусь 1». Потым за яго ростам можна было сачыць па праектах «Беларусь LIFE», «Сімвал Перамогі», яго аўтарству належаць прамаролікі для «Еўрабачання», абноўленай праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!», да 70-годдзя Вялікай Перамогі «Такая Перамога ёсць не ў кожнага народа». Таму мы зноў сустрэліся з Юрыем Ярошыкам, каб пагаварыць аб працоўных буднях, уражаннях і набытках, якія застаюцца па-за кадрам.**

***— Нядаўна ў эфіры стартаваў новы сезон праекта «Нашы»...***

— У гэтай праграме было шмат розных адгалінаванняў. Калі ўспомніць, то першыя яе героі — простыя людзі, якія жывуць побач з намі. Потым рабілі цыкл, прысвечаны Алімпійскім гульням і беларускім спартсменам, — «Нашы чэмпіёны», героям мінулых часоў «Нашы. Рэтра», былі і «Нашы ў свеце». Цяпер сезон называецца «Нашы таленты», і ў ім выпускі будуць прысвечаны беларускім музыкантам. Пачалося ўсё 11 мая з гісторыі Аляксандра Іванова (Ivan) напярэдадні яго выступлення на «Еўрабачанні». Працягнулася — гісторыяй групы «Би-2». Нам удалося здабыць эксклюзіў — мы знайшлі дзяўчыну, якой прысвечана песня «Мой рок-н-рол» у Бабруйску (там нарадзіўся Шура з гурта). Таксама даведаліся, хто напісаў, акрамя саміх салістаў, песні «Варвара», «Дурочка», «Корабль плывет». Наперадзе гледачоў чакаюць цікавыя гісторыі пра гурты «Без білета», «Серебрянная свадьба», раскажам таксама пра маладога артыста Клоўна Ракету.

***— Ці не зменіцца працягласць выпускаў, каб расказваць новыя гісторыі?***

— Хранаметраж у нас застанецца, як і раней, 15-хвілінным. І, вядома, што пры такой абмежаванасці ў часе многімі цікавымі момантамі здымак, фактамі даводзіцца ахвяраваць. З некаторымі артыстамі нам удавалася доўга размаўляць. Пра таго ж Ivana можна проста гадзінны фільм выдаваць, бо шмат здымалі яго ў сувязі з падрыхтоўкай да конкурсу. Сустрэча і праца з «Би-2» праходзіла зусім у іншай атмасферы. Нам сказалі, што маем пяць хвілін... Таму мы выстаўлялі дэкарацыі і аб'ядноўвалі прэс-канферэнцыю з нашым інтэрв'ю, каб здабыць фактуру. А потым іх дырэктар зрабіў нам прапанову паехаць з артыстамі ў Бабруйск, дзе гурт у той дзень даваў канцэрт. І дзякуючы гэтаму мы ўбачылі школу, музычнае вучылішча, у якіх вучыўся Шура. Пазнаёміліся з тымі людзьмі, з кім ён пачынаў свой шлях у музыцы, а потым ужо літаральна перад канцэртам запісвалі з артыстамі гутарку ў калідоры, калі ў іх выдавалася вольная хвілінка.




**— Чым прываблівае цябе праца над праектам «Нашы»?**

— У ім я зараз задзейнічаны як аўтар і рэжысёр. І праект «Нашы» мне падабаецца перш за ўсё з-за таго, што няма нічога больш цікавага, чым гісторыі іншых людзей. Калі мы толькі пачыналі яго рабіць, то я адразу прапанаваў калегам, каб мы стваралі яго ў выглядзе дакументальных фільмаў, дзе знікне ўвесь закадравы тэкст, а застанецца толькі жывая гутарка з героямі і людзьмі, якія іх ведаюць. І потым, пераглядаючы мінулыя выпускі, я разумеў, што няма нічога лепшага для мяне, чым па крупінках збіраць гісторыі сваіх герояў. Я лічу гэты праект больш рэжысёрскім, чым журналісцкім, бо робім мы сапраўднае дакументальнае кіно, а не рэпартаж.

**«Мяне ўвесь час блыталі з прадстаўніком Эстоніі Юрыем Поатсманам, мы нават цёзкі. І варта было Яўгену Перліну пра гэта згадаць у каментарыі візіткі канкурсанта, як пачалося...»**

***— Маючы магчымасць працаваць і ў кадры, і па-за кадрам, дзе за гады працы на тэлебачанні адчуваеш сябе больш упэўненым?***

— У якасці вядучага мару, што змагу аднойчы працаваць у ранішняй праграме накшталт «Добрай раніцы, Беларусь!» альбо ў вячэрнім шоу. А рэжысурай я сёння займаюся непасрэдна, ствараючы прамаролікі, дакументальныя праекты. І, вядома, працуючы ў прамым эфіры, атрымліваеш неверагодны драйв, але ў ролі рэжысёра маеш магчымасць дзяліцца сваім бачаннем праз тое, што адбываецца на экране. У мяне часам нават здараюцца выпадкі, калі мяне просяць, знаходзячыся ў кадры, «выключаць» рэжысёра. Тады вельмі важна разняволіцца і зразумець, што за камерай працуюць таксама прафесіяналы, аператары, рэжысёры, якія маюць свае погляды, і даверыцца гэтым людзям. Напрыклад, падчас здымак у Грузіі мы працавалі з камандай праекта «Арол і рэшка» і там мне было камфортна, бо я арыентаваўся зрабіць тое, чаго ад мяне патрабавалі. Таму хоць у рэжысёра і больш свабоды для творчасці, але разам з тым і адказнасць на тваіх плячах зусім іншая...

***— Дарэчы, ці плануецца працяг праекта ў стылі «Вандроўкі па Грузіі»?***

— Падчас здымак згаданага праекта я спасціг вельмі важную рэч: больш важнымі за інфармацыю з'яўляюцца эмоцыі. У наш час, калі тэлебачанне сыходзіць у інтэрнэт, ты разумееш — калі ты не зачапіў тэлегледача, то ён пераключыць ролік, а значыць, трэба даць яму эмоцый па максімуме і быць жывым і натуральным у кадры. Тады тэлеглядач зацікавіцца і знойдзе тое, што шукае, у тым ліку і новую, карысную для сябе інфармацыю. Мне хочацца летам прыкладна ў такім жа фармаце зрабіць праграму пра падарожжы па Беларусі. Бо, па-першае, адпачываць за мяжой цяпер дарагавата, а, па-другое, не заўсёды бяспечна. І таму я хачу пераканацца і паведаміць іншым, што ўсё, што мы шукаем у Еўропе, ёсць і тут. Разумею, што сёння існуе шмат праграм пра падарожжы, але хочацца зацікавіць гледача сваім маршрутам, эмоцыямі...

***— Работа над праектам «Падарожжа па Грузіі», відаць, добра цябе натхніла...***

— Перш за ўсё, там я прайшоў для сябе абсалютна новую прафесійную школу. У нас былі здымкі летняй і зімняй Грузіі. Памятаю, у першы здымачны дзень я пачаў агучваць нейкую адпаведную, як мне здавалася, інфармацыю, і тут мне ў адказ — не тое! Нам патрэбны эмоцыі, жывыя каментарыі! І вось два тыдні работы з новай камандай далі мне проста неверагодны вопыт. Папрацаваць удалося і ў гарах, і ў пустыні, ў горадзе, і на моры... Адчуванне — быццам пабываў адразу ва ўсіх кліматычных зонах. Можна сказаць, я прымяраў на сябе ролю экстрэмальнага вядучага і на любыя прапановы здымачнай групы ці то гатаваць, ці купацца альбо залезці кудысьці згаджаўся і ўвасабляў у жыццё. Нават неаднойчы з сябе жартаваў, што людзі прывозяць з падарожжаў магнiцікі, а ў мяне замест іх на целе шрамы.

***— Якія рэцэпты асвоіў у працэсе здымак?***

— Што тычыцца грузінскай кухні, то я многія стравы навучыўся гатаваць. Шашлык, хінкалі, хачапуры па-аджарску, па-кахецінску, па-кутаіску, па-длісцку, па-мецінску (у іх там у кожным рэгіёне свой рэцэпт), таксама ўмею цяпер адціскаць віно, вытрымліваць яго... Думаю, калі што, — можна смела адчыняць свой рэстаранчык грузінскай кухні. Стаў такім беларускім грузінам.

***— Увогуле, калі ты падарожнічаеш, то што для цябе найбольш важна — знаёміцца, каштаваць ежу ці глядзець краявіды?***

— Самае лепшае для мяне — гэта знайсці варыянт, дзе будуць спалучацца пляжны адпачынак і таксама магчымасць знаёміцца з новымі людзьмі, даведвацца пра іх жыццё, смакаваць мясцовую кухню і любавацца тым, што засталося ім у спадчыну ад продкаў.

***— Ведаю, што ты не адзін год ездзіш на «Еўрабачанне» ў складзе здымачнай групы. Якая атмасфера гэтага конкурсу знутры?***

— Гэта было ўжо пятае песеннае спаборніцтва, асвятленнем якога я займаўся. Мне «Еўрабачанне» нагадвае алімпіяду з тым толькі адрозненнем, што там тэлегледачы могуць уплываць на вынікі, а не проста «хварэць» каля экранаў. І да прадстаўнікоў Беларусі там ставяцца заўсёды добра. А нашы артысты дастойна выступаюць. Сёлета ўсе — ад прадзюсараў з розных краін да арганізатараў — былі шакіраваны ад таго, што Ivan не прайшоў у фінал. Нумар быў па-сапраўднаму класны! Вядучы шоу Монс Самерлёв нават зрабіў рэвеpанс у наш бок, калі выйшаў на сцэну аголены і з цацачным ваўком. Пра нашага прадстаўніка пісалі выданні ва ўсім свеце, у тым ліку амерыканскі GQ, Guardian, BBC, а значыць, успаміналі Беларусь, а гэта галоўнае.

**Сустрэча і праца з «Би-2» праходзіла зусім у іншай атмасферы. Нам сказалі, што маем пяць хвілін... Таму мы выстаўлялі дэкарацыі і аб'ядноўвалі прэс-канферэнцыю з нашым інтэрв'ю, каб здабыць фактуру.**

Калі казаць пра эмоцыі падчас прагляду шоу, то там адбываецца нешта неверагоднае. Напрыклад, калі ў свой час выступала Ларын, то ў глядзельнай зале панавала сапраўдная эйфарыя. Альбо сёлета, можна сказаць, быў проста бум тэхналогій: праекцыя з ценямі ў Ісландыі, першая галаграма на конкурсе ад Беларусі, шоу з 3d-мапінгам ад Расіі... Але ў выніку перамагла эмоцыя Джамалы з песняй «1944» — дарэчы, адзіная кампазіцыя, ад якой у мяне бегалі мурашкі. Яшчэ мяне ўвесь час блыталі з прадстаўніком Эстоніі Юрыем Поатсманам, мы нават цёзкі. І варта было Яўгену Перліну пра гэта згадаць у каментарыі візіткі канкурсанта, як пачалося... Потым да мяне падыходзілі і пыталі, чаму я не прайшоў у фінал. І так цудоўна, калі ёсць магчымасць убачыць закулісе такога песеннага форуму і адчуць яго атмасферу. Але для мяне галоўнае, што ўбачаць тэлегледачы. Мне як тэлевізійніку вельмі падабаецца, як там працуе каманда арганізатараў самога шоу. У іх усё распісана па хвілінках, пачынаючы ад рэпетыцый і заканчваючы фінальным выступленнем канкурсантаў. Кожны крок, рух адбываецца зладжана і дакладна. На такое варта паглядзець кожнаму прафесіяналу, які працуе на тэлебачанні.



На «Еўрабачанні-2016» вядучага часта прымалі за эстонца Юрыя Поатсмана.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!

Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома).
Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** У панядзелак рэкамендуецца не здзяйсняць сур'ёзных учынкаў і не прымаць важных рашэнняў. Сітуацыя выйдзе з-пад вашага кантролю, і падзеі, якія адбудуцца, могуць моцна вас знерваваць, але актыўныя дзеянні з вашага боку толькі ўсё пагоршаць. Неабходна адпусціць сітуацыю і не ўмешвацца, проста пачакаць, пакуль усё вырашыцца само сабой. Да канца тыдня ўсё прыйдзе ў норму, сваркі і канфлікты адыдуць, і ваш настрой палепшыцца. На выхадныя ўжо можна планаваць важныя мерапрыемствы, але лепш іх прысвяціць адпачынку.



**СКАРПІЁН.** Калі вы выразна ведаеце, чаго хочаце, то тады вам усе карты ў рукі. Тыдзень актыўны і дынамічны, ёсць маса шанцаў праявіць сябе, адкрыць новыя кірункі дзейнасці і ўвязацца ў сур'ёзнае мерапрыемства. Перш за ўсё, вам трэба ўяўляць канчатковую мэту, тое, чаго вы хочаце дасягнуць. Марнаваць час на планаванне саміх дзеянняў неабавязкова. Інтуіцыя і ўнутранае чуццё падкажуць вам, як дзейнічаць у той ці іншай сітуацыі, асабліва калі ўлічваць, што сітуацыі часта мяняюцца, то планы — наогул лішняе. Канчатковы вынік вашай дзейнасці не можа не парадаваць



**СТРАЛЕЦ.** У пачатку тыдня перад вамі паўстане дылема, якую будзе не вельмі проста вырашыць, ды яшчэ так, каб апынуцца ў выйгрышы. Падобная сітуацыя можа справакаваць канфлікт з блізкімі людзьмі. У сярэдзіне тыдня будзеце асабліва імпульсіўныя, пастараецеся вырашыць усе справы і ўсе праблемы адным махам, што, вядома, не так лёгка, але ўсё ж можа атрымацца. Спрыяльным для асабістага жыцця выпадае канец тыдня.



**КАЗЯРОГ.** У першай палове тыдня будзе аддавацца рэхам стомленасць і напружанасць мінулых дзён. Але ў хуткім часе вы зможаце разварушыцца, падставай для гэтага можа быць цікавая вестка або запрашэнне ад блізкіх людзей. У сярэдзіне тыдня вас могуць чакаць розныя кантакты і сустрэчы і нават новыя крыніцы натхнення. Бліжэй да канца тыдня зможаце дасягнуць спрыяльнага і спакойнага стану, што дазволіць у поўнай меры адпачыць. Гэты час варта прысвяціць сабе і сям'і.



**ВАДАЛЕЙ.** У пачатку тыдня ад вас спатрэбіцца прыняцце ўзважанага рашэння, няспешнага і якаснага асэнсавання сітуацыі і толькі пасля гэтага якіх-небудзь дзеянняў. Правільны выбар прынясе поспех як у справах фінансавых, так і ў асабістых. Ёсць верагоднасць завесці новае знаёмства. Асабліва ярка пачуцці могуць праявіцца напрыканцы тыдня, нават старыя адносіны могуць успыхнуць новым запалам. Тыдзень таксама спрыяе праяве клопату пра іншых людзей, таму ў вас можа з'явіцца жаданне наведаць пажылых сваякоў або завесці хатняга гадаванца.



**РЫБЫ.** Тыдзень сур'ёзных здзяйсненняў. З самага яго пачатку вы настроіцеся на працоўны лад, паставіце перад сабой выразную мэту і ўпэўнена пойдзеце да яе дасягнення. Вы будзеце схільныя дзейнічаць напрамую і здольныя вырашыць практычна любое пытанне, што, перш за ўсё, добра ў рабочай сферы, але можа спатрэбіцца і ў справах сямейных. Інтуіцыя асабліва моцна абвострыцца ў сярэдзіне тыдня, а следам за ёй і разуменне першапрычын усяго таго, што адбываецца. Гэта вам вельмі дапаможа ў вырашэнні спрэчных сітуацый, навучанні і ажыццяўленні пастаўленых перад сабой планаў.

# Чацвер, 2 чэрвеня

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х.
**8.50** Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на ІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі (з сурдаперакладам).
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.55** Уступныя іспыты па рускай мове ў V клас гімназій, гімназій-інтэрнатаў, гімназій каледжаў мастацтваў.
**11.05, 20.00 Серыял «Грачанка».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.55 Серыял «Айцец Мацвей».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.45** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Трэцяя сусветная».
**11.15, 17.50 Серыял «Вароніны».**
**12.20, 19.00 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.25** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.15 Трылер «Закрытая школа».**
**17.20** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.40 Серыял «Быць чалавекам».**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25, 18.25, 21.00** «Калейдаскоп».
**7.55, 19.25 «Чырвонае і чорнае». Драма.**
**9.05** «Рака жыцця». Дак. фільм.
**10.00 «Край». Драма.**
**12.00** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Аляксея Кузьміча.
**12.45 «Мост». Драма.**
**14.25** «Сіла веры».
**14.50 «Рудабельская рэспубліка». Маст. фільм.**
**16.25** «Кіно і час». Рудабельская рэспубліка.
**17.05 «Ілюзія палявання». Дэтэктыў.**
**18.00** «Навукаманія».
**18.45, 21.15** «Брэжнеў, якога мы не ведалі». Дак. фільм. 2-я серыя «Вікторыя Брэжнева. Простыя рэцэпты жонкі генсека».
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «Жыві і памятай». Драма.**

## Беларусь 5

**8.00, 18.50, 21.20** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Тэніс. Ралан Гарос. 1/4 фіналу.
**10.15** Гандбол. Кваліфікацыя да Еўра-2016. Жанчыны. Беларусь — Нарвегія.
**11.45** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі.
**13.40** «На шляху да Еўра-2016». Відэачасопіс.
**14.10** Козел пра футбол.
**14.30** «Адзін крок на шляху да Алімпа». Мастацкая гімнастыка. Відэачасопіс.
**15.00** «Жанчыны і спорт». Меліціна Станюта.
**15.30** Слэм-данк.
**16.00** Тэніс. Ралан Гарос. Жанчыны. 1/2 фіналу.
**18.55** Баскетбол. Кубак Халіпскага. Жанчыны. Беларусь — Новая Зеландыя.
**20.45** «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.
**21.30** Змешаныя адзінаборствы. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Практыка».**
**23.15** «Гарады-героі». Сталінград.
**0.05** «На ноч гледзячы».
**0.55** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.35** «Вадзіць па-руску».
**16.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**0.30 «Пантэра». Серыял.**
**2.00** Дак. фільм «Атланты з планеты Сірыус».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30 Маст. фільм «Падкідыш».**
**10.50 Маст. фільм «Італьянец».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Цяжар абеду».
**13.45, 19.20 Серыял «Я вярнуся».**
**15.30, 2.20** «Справы сямейныя».
**16.20** Дак. цыкл «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**16.50** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20, 0.45 Серыял «Чорны снег 2».**
**21.05 Маст. фільм «Пяць гадоў і адзін дзень».**
**22.55 Серыял «Хто памнажае смутак».**
**23.55** Ток-шоу «Слова за слова».
**2.45** «Іншы свет».
**3.15** «Народы Расіі».
**4.05 Маст. фільм «Мама выйшла замуж».**
**5.25** «Зроблена ў СССР».

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «Заставы ў акіяне. Вяртанне». «Пагрозы сучаснага свету. Атамны краш-тэст». «Пагрозы сучаснага свету. Атамная альтэрнатыва».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Мар'ін гай-2».**
**19.10, 20.50 Серыял «Водар шыпшыны».**
**21.55, 23.10 Серыял «На далёкай заставе».**
**23.45** «Паядынак».

## НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 22.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Ціхае паляванне».**
**15.00, 16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Стэпавыя ваўкі».**
**22.35** «Вынікі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**

## 8 канал

**7.00, 14.25, 20.00, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.40, 20.05 Серыял «Вечнасць».**
**8.30 Серыял «Забі і вылечы».**
**9.35 Серыял «Пад купалам».**
**10.30** «Свой фермер. Другі сезон».
**11.00 Драма «Апакаліпсіс».**
**13.15 Серыял «Бездань».**
**14.15, 17.00, 18.40, 21.00** «Хатняя крама».
**14.30 Серыял «Нашчадкі».**
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.10 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**18.45 Серыял «Складанасці».**
**19.45** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Камедыя «Вялікая прагулка».**
**23.10 Серыял «Торн».**

## ВТБ

**6.00, 17.00** «Лаві момант».
**6.30, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.20** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны 3».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Беглыя сваякі».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Пушкін».
**11.30** Камедыя «Рымскія спатканні».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Камедыя «All inclusive, або Усё ўключана».
**23.30, 3.30** Серыял «Выжыць пасля».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

## Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15, 14.55, 17.25, 20.00, 23.35** Карамзін — 250.
**11.20, 0.00** Серыял «Каломба».
**12.35** «Сцяг і аркестр, наперад!..» Дак. фільм.
**13.00** «Расія, любоў мая!» «Каракскія традыцыі».
**13.30, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.55** «Забытыя царыцы Егіпта». Дак. фільм.
**15.10** «А.С. Пушкін. Тысяча радкоў пра каханне».
**15.35** Маст. фільм «Дуброўскі».
**16.45, 1.15** «Больш, чым каханне». Міхаіл Ларыёнаў і Наталля Ганчарова.
**17.30** Тамара Сіняўская. Майстар-клас.
**18.30, 1.55** «Паліглот». Кітайскі з нуля за 16 гадзін!
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**21.15** «Культурная рэвалюцыя».
**22.00** Ступені цывілізацыі. «Нім — французскі Рым». Дак. фільм.
**22.50** «Рыбакоў, сын Рыбакова, унук Рыбакова». Дак. Фільм.
**23.55** Мастсавет.
**2.40** Сусветныя скарбы.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Першыя каапературывы». 2005 год.
**7.00** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».
**7.15, 8.45, 9.40, 11.00, 12.55, 14.45, 15.40, 17.00, 18.45, 19.15, 20.45, 21.40, 23.00, 1.05, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.30** Маст. фільм «Збягаючы жнівень».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Уладзімір Турыянскі. 2007 год.
**13.20** Маст. фільм «Уварванне».
**17.15** «Я сама». Тэма: «У мяне п'е муж». 1995 год.
**18.00** «Яловая субмарына». У гасцях у А. Ліпніцкага Ілья Кармільцаў. 2005 год.
**18.55** Дак. фільм «Хто за сцяной?»
**19.30** Маст. фільм «Дыялог з працягам».
**0.00** Дак. фільм «Яўген Габрыловіч».
**01.20** Маст. фільм «Пачатак».

## EuroSport 1

**4.00, 7.00, 11.30, 16.00, 21.30, 0.30** Тэніс. «Ралан Гарос».
**6.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**6.30** Футбол. Чэмпіянат MLS. Лепшыя моманты.
**8.00** Веласпорт. Джыра-д'Італія. Лепшае.
**9.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC. Поўны доступ.
**9.30** Аўтаспорт. «Лондан кліча».
**10.30, 14.45, 20.30** Тэніс. «Ралан Гарос». Матч дня.
**14.15, 15.45, 20.00, 1.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
**23.30** Футбол.
**0.00** Ралі ERC.
**2.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.

## Камедыя

**0.20** Камедыя «Нешта падобнае на шчасце».
**2.00** Баявік «Бясстрашная гіена 2».
**3.40** Меладрама «Па прыкметах сумяшчальнасці».
**5.15** Драма «Сэрца воіна».
**6.55** Камедыя «Люблю цябе на ўсіх мовах свету».
**8.40** Камедыя «Дзіўныя сваякі».
**10.20** Меладрама «Мой самы страшны кашмар».
**12.05** Камедыя «Вялікі Стэн».
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.10** Камедыя «Піжон».
**17.50** Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі»
**19.30** Меладрама «Спачатку каханне, потым вяселле».
**21.10** Камедыя «Справа ў табе».
**22.50** Прыгоды «Цудоўная чацвёрка».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45** «Доктар І...»
**8.15, 18.55, 0.50** «Падарунак лёсу». Серыял.
**10.00, 3.25** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 4.10** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.50, 16.00** «Хатні рэстаран».
**12.45** «Магія прыгажосці».
**13.40** «Тайныя знакі».
**14.35, 5.00** «Псіхасаматыка».
**15.05** «Каменская». Серыял.
**16.55, 21.50** «З нябёсаў на зямлю». Серыял.
**17.55** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**20.55, 0.05** «М.У.Р». Серыял.
**22.40, 5.30** «Зоркі і містыка».
**23.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**2.35** «Нераскрытыя тайны».

## ТБ1000

**6.10, 18.10** Драма «Нешта не так з Кевінам».
**8.10, 2.15** Меладрама «Крок наперад: Усё або нічога».
**10.15** Камедыя «Прыгоды Падзінгтана».
**12.10, 4.10** Баявік «Тэрмінатар: Няхай прыйдзе выратавальнік».
**14.20** Драма «Бабёр».
**16.10** Мюзікл «Мары здзяйсняюцца!»
**20.10** Трылер «Палонніцы».
**22.45** Фантастыка «Пасвячоны».
**0.30** Драма «Вераніка вырашае памерці».

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 0.20** Фантастыка «Паляўнічы».
**8.25, 2.30** Меладрама «Унук касманаўта».
**10.10, 4.25** Трылер «Клетка».



**12.20** Прыгоды «Што ў Сенькі было».
**14.10** Драма «Дурань».
**16.20** Меладрама «Яшчэ адзін год».
**18.25** Камедыя «Стары новы дом».
**20.20** Камедыя «Алімпійская вёска».
**22.10** Фантастыка «Ракавыя яйкі».

## National Geographic

**6.00** Непаражальныя канструкцыі.
**6.50** Зрабі або памры.
**7.10, 13.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.35, 10.45, 17.05, 21.00, 0.55, 4.00** Каралі шахт.
**8.20, 17.50, 21.45, 1.40, 4.50** Дзікі тунец.
**9.10, 11.35, 14.00, 19.30** Сапраўдны суперкар.
**10.00, 14.45, 20.10** Аўта-SOS.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**13.40** Гульні розуму.
**15.30** Па слядах міфічных пачвараў.
**16.20** У пошуках плямёнаў паляўнічых.
**18.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.35** Эвакуацыя Зямлі.
**23.20, 2.30** Паранармальнае.
**0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.

## Discovery

**8.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**11.00, 7.10** Голыя і напалоханыя.
**12.00** Што ў вас у гаражы?
**13.00, 6.20** Глядзі ва ўсе вочы.
**15.00, 5.30** Браты Дызель.
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Паляўнічыя на склады.
**19.00** Бітвы за кантэйнеры.
**20.00** Скарбы з каморкі.
**21.00** Як гэта зроблена?
**21.30** Як гэта ўстроена?
**22.00, 23.00** Залатая ліхаманка.
**0.00** Смяротная гутарка.
**1.00** Пешшу ўздоўж Ніла.
**2.00, 4.40** Грошы ў засеках.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.




## У СТРАХА ВОЧЫ ПА ЯБЛЫКУ

...У дзявятым класе сярэдняй школы нас залічылі ў вучэбна-вытворчы камбінат, дзе можна было атрымаць рабочую прафесію. Я, напрыклад, вучыўся на шафёра — на кіроўцу катэгорыі «С», і ў адной групе са мной былі хлопцы з суседняга мястэчка Першаі. Некага з іх я ведаў дрэнна, некага — лепш. Але ж праз нейкі час стаў заўважаць, што ўсе яны неяк дзіўна пазіраюць на мяне і не тое, каб дужа цураюцца, але неяк пабойваюцца ці што...

Мяне гэта, ну вядома ж, інтрыгавала, хоць выгляду не падаваў, бо ведаў, што час — ён такі, ён усе па сваіх месцах расставіць.

І сапраўды ідуць заняткі, ідуць нейкія размовы... Да мяне падыходзяць хлопцы, пытаюцца пра каратэ: дзе, маўляў, можна запісацца ў спартыўную секцыю, як часта праходзяць трэніроўкі, ці многа бывае траўмаў?

Я без задняй думкі кажу ім усё, што ведаю. І пры гэтым заўважаю, што некалькі маіх аднакласнікаў аж душацца ад смеху.

З чаго б гэта? Спыніў неяк аднаго з іх і хацеў распачаць допыт. Але той адразу ж прызнаўся, што гэта жарт такі: нашы хлопцы папярэдзілі першайскіх — маўляў, са мною лепш не звязвацца, бо я пад гарачую руку...

Карацей, яны прыдумалі цэлую байку пра тое, што я доўга ездзіў у Мінск, у адной са спартыўных секцый займаўся каратэ, што ў мяне падчас трэніровак не атрымліваўся нейкі прыём, таму трэнер абазваў мяне брыдкім словам. А я ў адказ вельмі раззлаваўся: не разлічыўшы сілы, нанёс удар... І сеў бы ў турму, але ж нейкім цудам, па вялікім блаце мяне ўдалося «адмазаць»...

Карацей, мае аднакласнікі пасмяяліся з першайскіх хлопцаў.

Тыя, дарэчы таксама... Калі даведаліся, што я ніякі не каратыст.

**Ігар Солтан,**
*г. Івянец.*

## «СІТУАЦЫЯ ВЫЙШЛА З-ПАД КАНТРОЛЮ»

Неяк у пятніцу Мікола атрымаў зарплату. Па старой завядзёнцы скінуўся з мужыкамі «на піва». Разам зайшлі ў кафэ, узялі пляшачку беленькай, потым яшчэ адну. Так што дадому гаспадар ледзьве прывалокся...

Жонка, убачыўшы яго, вядома ж, папракнула, спытала, калі гэта скончыцца?!. Потым прыпомніла мужу ўсё, у чым ён правініўся, і які ўжо раз паабяцала, што, калі ён не спыніцца — будзе і далей заўляцца дадому п'яным — то развядзецца, не будзе з ім жыць...

А вось што далей было, сужэнцы не зразумелі — ні тады, ні потым. Ім — ці паверыце — голас быў. Гэта значыць, што ў пакоі ні села ні пала, загучала рашучае: «Сітуацыя выйшла з-пад кантролю. Трэба тэрмінова прымаць меры!»

І цішыня, як той казаў...

Сужэнцы азірнуліся па баках: тэлевізар ніхто не ўключаў, вокны ў хаце зачыненыя, радыё трэці дзень як сапсаванае... Тады хто гэта і адкуль? Ды з такімі словамі...

Мікола адразу ж працверазеў. Паліна не на жарт спужалася. Яны пераглянуліся і... зарагаталі... Удваіх, да ікаўкі.

...Пасля гэтага, як і варта было чакаць, сужэнцы памірыліся. Мікола прызнаўся, што па-ранейшаму кахае Палінку, што без яе, сваёй палавінкі, не ўяўляе жыцця. А ўрэшце — слова ёй даў, што прыслухаецца да голасу радыёцешчы, не будзе больш выпіваць з сябрамі.

А можа, і яны, паглядзеўшы на сябра, падумаюць пра жонак, пра дзяцей, пра ўласнае здароўе і — пакуль «сітуацыя пад кантролем» — ад дурнога адмовяцца таксама?

**Галіна Нічыпаровіч,**
*в. Магільна, Уздзенскі раён.*

## БЫЛА Б СВІННЯ... А ПАРАСЯТКІ БУДУЦЬ

Не так часта, дзякаваць Богу, але ж бываюць дні, калі на вуліцу лепш не высоўвацца. Надвор'е — не дай Бог! Пра такое нашы продкі добра казалі: «Не пі, не еш і з хаты не вылазь».

Я ў той дзень дакладна сядзеў бы дома, бо спёка — проста страшэнная, але ж забегла наша суседка цётка Зося і з парога мне: так і так, маўляў, свіння ў нас гукуе... І не загнаць! Дапамагчы трэба.

Трэба, дык трэба: рушыў я на вуліцу. Бачу, дзядзька Пеця (цётчын муж) там адзін упіраецца: з дапамогай дубца ды грозных мацюкоў свінню з кустоў «выкалупвае». А тая, хітруха, добра прыдумала — на бок залягла і нават вухам не вядзе. Паспрабавалі падняць яе, на ногі паставіць — дзе там, не далі рады.

Добра, што гэта — вёска, добра, што людзі там спрэс свае, знаёмыя, міма чужой бяды не праходзяць. Жанчына адна запынілася, убачыла нашы патугі і кажа:

— А можа, вашу «нявесту» на тачцы завезці? У мяне ёсць — самаробная, ладная, якраз для вашай свінні.

Іншых ідэй у нас не было — згадзіліся на гэту. Жанчына падагнала той «агрэгат», мы нейкім цудам ускацілі на яго таўстуху-свінню і павезлі.

Відовішча — трэба сказаць — было яшчэ тое: я ва ўсякім разе весялейшых ніколі не назіраў... Хоць бы таму, што тачка па сваёй канструкцыі была досыць глыбокай, але ж, як для нашай «пасажыркі», дык караткаватай. А таму свіння ехала ў ёй... паўседзячы — пярэднімі нагамі за борцікі «трымалася». А мы ў той «пані» ў возчыках былі, шкада — без званочкаў. Іх на дзядзьку Пецю добра было б начапіць, бо ён — як жэрдка, высокі, худы — сагнуўшыся ў тры пагібелі, за дышаль тачку цягнуў, не-не ды і спатыкаўся бывала, падаў носам у пясок, бо, вядома ж, цяжка... Хоць мы з цёткай і ўпіраліся, — падпіхалі то тачку, то свінню...

Але ж і смеху стрымаць не маглі...

Вось так, пад рогат — свой і сустрэчных — мы дабраліся да патрэбнага нам падворка. І там — што вы думаеце — нашу пасажырку быццам падмянілі! Дзе дзеліся яе млявасць ды абыякавасць да жыцця: таўстуха, як той казаў, сканцэнтравалася, зламаўшы дышаль, выскачыла з «карэты» і галопам паімчала ў патрэбны двор. Добра, што гаспадыня загадзя расчыніла і вароты, і хлеў.

Праўда, наша «нявеста» рванула не ў іх, не да «жаніха», — у іншы канец падворка.

Тут, мусіць, варта сказаць, што гаспадар яго працаваў трактарыстам і, відаць, як многія, паўкола ад вялізнага К-700 прыстасаваў пад паілку для скаціны. Збоку яна была падобнай да глыбокіх арэляў ці, можа, крэсла-качалкі...

Якраз туды свіння і панеслася. А ўжо там з усяго разгону плюхнулася ў «басейн». Выціснутая вада, вядома ж, паляцела вонкі, нас ледзь не зваліла з ног... Пярэстая ж, адшукаўшы прахалоду, у позе ўсё той жа «пані» задаволена рохкала ды пагойдвалася ў паілцы.

Мы зноў зайшліся ад рогату: ну сапраўды, якая ж нявеста пойдзе да жаніха не прыняўшы ванну?!

Іншая рэч, колькі ў ёй пялёскацца. Ну пяць хвілін... Ну дзесяць... Але вылазіць з вады кульпальшчыца не згаджалася і праз пятнаццаць. Прыйшлося нам з дзядзькам на лік «тры» кульнуць тую «ванну» — разам з акуратысткай.

Свіння гэта зразумела правільна: ускочыла на ногі, стрэсла з сябе ваду і толькі тады пайшла да адчыненых дзвярэй, да «жаніха», з-за якога ў той дзень яна столькі адпакутавала...

Шчыра кажучы, хапіла і нам. А таму я зусім не здзівіўся, калі надвячоркам суседзі паклікалі мяне ў садок — каб пачаставаць, каб адзначыць за дапамогу і яшчэ раз пагаварыць пра паводзіны сваёй гадаванкі.

Пра свінню, дарэчы, любяць казаць, што яна заўсёды гразь сабе знойдзе. Але ж — наколькі ведаю — гэта няпраўда, бо свіння шукае не гразь, а менавіта ваду.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

## БЕДНАЯ МЫШКА

...У нашай вёсцы яшчэ жыве традыцыя цяжкую працу рабіць талакой. Будавацца ўжо мала хто будуецца, а вось з бульбай, напрыклад, клопат застаўся. Вяскоўцы групуюцца, каб дапамагчы адзін аднаму дастаць са скляпоў насенне, потым — каб пасадзіць другі хлеб, а нарэшце — каб выбраць.

Дык вось неяк па вясне сышліся мы перабіраць бульбу да маёй суседкі.

Яна, як гаспадыня, першай палезла ў склеп... А мы — проста не паспелі, бо тая, амаль адразу ж, куляй ды яшчэ і з піскам — кінулася назад.

— Што зрабілася? — пытаемся мы.

— Там жаба.

— Ну і што?

— Я іх баюся.

Прыйшлося адной з кабет спусціцца ў склеп, злавіць тую жывёлінку і занесці ў куст бэзу. Уся ж астатняя талака стала смяяцца, стала прыгадваць, хто калі і чаго спалохаўся.

— Я неяк сабраўся на вечарынку: напрасаваў сабе порткі, прыбраўся ў новую кашулю, — расказваў адзін з мужчын, — а тут, як на ліха, маці... І з даручэннем: будзеш, маўляў, выходзіць з дому, сыпані там зерня курам... Мне, значыць, трэба ў чыстай адзежы ісці ў камору. А там нават святла не было. Уполцемках, навобмацак я зачэрпнуў у міску зерня і чую — мне штосьмяккае ў рукаво юрк... А потым куляй уверх — да шыі, назад — да паясніцы, па спіне... Я стаю, па целе рукамі ляпаю, кашулю рву, крычу... Выскокваю на двор...

Уся наша талака, вядома ж, здагадалася, што ў рукаво чалавеку заляцела мыш, але ж слухала ды пасміхалася...

А вось каму не да смеху было, дык гэта малой унучцы адной з суседак. Тая аж збялела да жаху — вось-вось, здавалася, страціць прытомнасць.

Трэба было нешта рабіць, неяк ратаваць гэтае дзіця.

Я пачала здалёку, спытала ў расказчыка:

— А табе колькі ж гадоў было?

Малая з цікавасцю паглядзела на мяне, потым на дзядзьку.

— Ну, недзе больш за 20... Я са службы ўжо вярнуўся... А прычым тут узрост? — не зразумеў ён.

Прыйшлося гнуць сваю лінію далей, казаць:

— Ну паглядзіце на яго: вялікі, 20-гадовы бэйбус, а спалохаўся... І каго — маленечкай шэранькай мышкі! Яна ж, калі без хвосціка, як твой палец... А ты давай кашулю рваць: табе страшна, а ёй? Што яна перажыла ты думаў?

— Ды неяк у галаву не прыходзіла, — усміхнуўся мужчына.

А ён галоўнае, што ўсміхалася дзіця, што яно смела пазірала на баязлівага дзядзьку і, здаецца, ніколечкі не баялася мышэй.

Ну сапраўды — яны ж мілыя істоткі. Ва ўсялякім разе з-за іх, вось такіх, кашулю рваць зусім не варта.

**Ніна С,**
*Магілёўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў

## ШОСТЫ ПОЦІСК



### Пра супадзенні, якія не бываюць выпадковымі

НА мамінай радзіме, у Кукшавічах, што недалёка ад Станькава, мы бываем цяпер толькі раз на год — увесну на Радаўніцу. У самой вёсцы ўжо ні далёкай, ні блізкай радні не засталося, затое на мясцовых кладах іх — цэлая вуліца Клімовічаў. Я заўсёды па дарозе на тыя надзвычайн светлыя (сапраўды, бярозавы гай, пранізаны сонечнымі промнямі) могілкі думаю пра повязі, якія трымаюць нас за продкаў, адно за аднаго; пра супадзенні, якія не бываюць выпадковымі; пра памяць, якая перадаецца на падсвядомым узроўні наступным пакаленням. Пра людзей, якія сустракаюцца, знаёмяцца, ідуць па жыцці, ужо ведаючы адзін пра аднаго, але не здагадваючыся, што яшчэ да іх нараджэння было нешта, што калі не прадвызначыла іх сустрэчу, дык накрэсліла ў летапісе іх роду агульную старонку.

Машына імчала праз сонечнае майскае ранне, і ўбачанае на дарозе, прыгаданае, адчутае склалася ў выкшталцоны, але абсалютна лагічны ланцужок.

ВОСЬ вёска Скірмантава, амаль родная — тут жыве брат; сюды, у саўгасны дом культуры хадзілі за сем кіламетраў на дыскатэку. Вёску разам з жыхарамі ў 1943-м спалілі фашысты, у памяць пра гэта цяпер на плошчы стаіць мемарыял. Як гэта было, я чула ад жывога сведкі — Баляслава Феліцыянавіча Цехановіча. Ён, падлетак з суседніх Вертнікаў, у той спякотны дзень пасвіў паблізу кароў, і стаіўшыся ў хмызах, з жахам назіраў, як зганялі людзей у адрыну, як пасля падпалілі, як успыхвалі, бы свечкі, саламяныя стрэхі на хатах...

Расказаў мне гэта Баляслаў Феліцыянавіч далёка ад нашай з ім радзімы — у Моўчадзі, вёсцы на мяжы Баранавіцкага і Дзятлаўскага раёнаў, дзе ён жыў і працаваў. Мяне туды — у госці да дзеда з бабкай — запрасіла аднакурсніца Ірына (сама яна родам з Магілёўшчыны, з Крычава), з якой пасля сталі па жыцці найлепшымі сяброўкамі. З яе дзедам Болесем пра нашы родныя мясціны, пра трагедыю Скірмантава мы прагаварылі тады ўвесь вечар. І дзіўна і незвычайна было ўсведамляць, як пакручастыя сцяжыны лёсу вывелі нас адно да аднаго, можа, толькі дзеля таго, каб ён мог расказаць менавіта мне, якая магла не зразумець — дэталёва ўявіць — тое, што бачыў улетку 43-га...

Гадоў дзесяць спіць на каталіцкіх моўчадскіх могілках дзед Болесь, сама Ірына кожны год святкуе дзень Перамогі ў Берліне, а я назаўтра пасля свята еду праз Скірмантава, праз Вертнікі, праз Койданава да сваёй бабулі Надзеі. Яе разам з аднавяскоўцамі фашысты ганялі капаць магілу койданаўскім яўрэям. Бабуля, жонка чырвонага камандзіра, з дваімі малымі дзецьмі-пагодкамі цудам засталася жывой у пекле той вайны. Але гэты эпізод — калі над вялікай ямай, што яны выкапалі пад аўтаматамі, пасля два дні варушылася зямля і чуліся стогны — быў, здаецца, самы страшны ў яе ўспамінах. Яна нам, малым яшчэ, часта пра гэта расказвала. Дзеля чаго? Проста: каб помнілі.

А МОЖА, не так проста? Можа, дзеля таго, каб ужо праз дзвядцаць гадоў, як яе не стала, праз шэсцьдзясят гадоў пасля вайны, пазнаёміўшыся у Маскве з Сямёнам Рубіным, таксама журналістам, добрым, таленавітым хлопцам, я магла яму гэта расказаць? Бо, як высветлілася, менавіта там, у койданаўскай магіле ляжаць ягоныя дзед і бабуля... З Сямёнам з таго часу мы добрыя прыяцелі, летась ён прыязджаў у Мінск, мы разам ездзілі ў Койданава. І, памятаю, доўга пасля размаўлялі пра тое нешта, што накрэсліве ў летапісах зусім розных, не знаёмых да пэўнага часу людзей агульныя старонкі яшчэ да іх нараджэння...

Калісьці амерыканскія псіхолагі прыдумалі тэорыю шасці поціскаў рукі, згодна з якой любыя два чалавекі на планеце знаёмыя паміж сабой праз ланцужок агульных знаёмых, які ў сярэднім складаецца з пяці чалавек. Не ведаю, наколькі яна правільная, але, калі яна сапраўды працуе, бадай што для кожнага, хто мае дачыненне да Беларусі, адным з гэтых шасці поціскаў абавязкова будзе поціск мінулай вайны. І так будзе, я думаю, яшчэ не з адным пакаленнем. Ты можаш пра гэта нават не здагадвацца, а яна дыхне раптам холадам у самы твар і зазірне ў вочы пустымі вачніцамі.

ДЗЕЛЯ чаго? Вось тут, здаецца, сапраўды проста: каб помнілі.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## Жадаеце заняцца прыдарожным сэрвісам?

**У Беларусі зацверджана Генеральная схема развіцця прыдарожнага сэрвісу на рэспубліканскіх аўтадарогах.**

З мэтай далейшага развіцця прыдарожнага сэрвісу на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах прынята пастанова Міністэрства транспарту і камунікацый «Аб устанаўленні генеральнай схемы развіцця прыдарожнага сэрвісу на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах да 2020 года». У ёй адлюстраваны існуючыя аб'екты прыдарожнага сэрвісу (АЗС, пляцоўкі адпачынку, газазаправачныя станцыі, пункты харчавання, гасцініцы, СТА, мыйкі) на дарогах рэспубліканскага значэння з нумарацыяй «М» і «Р». Прыводзіцца пералік аб'ектаў сэрвісу, якія будуюцца або праектуюцца. Таксама для патэнцыйных інвестараў пазначаны прапановы для размяшчэння аб'ектаў уздоўж аўтадарог. Цяпер у стадыі будаўніцтва знаходзіцца 90 розных відаў аб'ектаў сэрвісу, яшчэ 224 праектуецца. Для перспектыўнага пашырэння і будаўніцтва новых сэрвісных комплексаў прапануюцца 475 аб'ектаў.

Падрабязна са зместам дакумента можна азнаёміцца ў інтэрнэце на сайце www.etalonline.by, а таксама на сайце Міністэрства транспарту і камунікацый у раздзеле «Дарожная гаспадарка» (падраздзел «Прыдарожны сэрвіс»).

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Путешествуйте с Visa»

**1.** Настоящая рекламная игра называется «Путешествуйте с Visa» (далее – «Игра»), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – «Правила») согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры платы.

**2. Сведения об организаторе.**

**2.1.** Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191548102 (далее – Организатор).

**2.2.** Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, пом. 20, ком. 46.

**2.3.** Заинтересованным лицом Игры является Корпорация Виза Интернэшнл Сервис Ассосиэйшн, 900 Метро Сентр Бульвар, Фостер Сити, Калифорния 94404, США (Visa International Service Association of 900 Metro Center Boulevard, Foster City, CA 94404, United States).

**3. Территория проведения Игры** – Республика Беларусь.

**4. Период проведения Игры** – с 01.06.2016 г. по 30.09.2016 г., включая период розыгрыша и вручения призов.

**5. Состав комиссии по проведению Игры.**

**5.1.** Председатель комиссии – Стельмах Александр Петрович, заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа Крама».

**5.2.** Члены комиссии:

**5.2.1.** Индивидуальный предприниматель Черненков Павел Леонидович, управляющий ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

**5.2.2.** Индивидуальный предприниматель Пелешок Ирина Владимировна;

**5.2.3.** Ерохин Вадим Витальевич, специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

**5.2.4.** Индивидуальный предприниматель Данилюк Екатерина Александровна - управляющий ООО «Яскрава».

**6.** Игра проводится в целях стимулирования безналичных расчетов (далее - безналичные операции) физическими лицами с использованием следующих банковских платежных карточек Visa Electron, Visa Classic, Visa Gold, Visa Platinum, Visa Infinite, Visa Business, Visa Business Gold, эмитированных следующими банками – резидентами Республики Беларусь (далее – «Банки-партнеры»):

- ЗАО «Альфа-Банк»
- ОАО «Белагропромбанк»
- ОАО «АСБ Беларусбанк»
- ОАО «БНБ-Банк»
- ОАО «Белгазпромбанк»
- ОАО «Белинвестбанк»
- ЗАО «БСБ Банк»
- ОАО «Банк БелВЭБ»
- ОАО «БПС-Сбербанк»
- ЗАО «БТА Банк»
- ОАО «Евроторгинвестбанк»
- ЗАО «Идея Банк»
- ЗАО «МТБанк»
- ОАО «Банк Москва-Минск»
- ОАО «Паритетбанк»
- ОАО «ПриорБанк»
- ЗАО «РРБ-Банк»
- ОАО «Технобанк»
- ЗАО «Трастбанк»
- ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)
- ЗАО «Цептер Банк»

**6.1.** При использовании в Правилах термин «банковская платежная карточка» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**7. Участники Игры.**

**7.1.** Участниками Игры могут быть физические лица, держатели банковских платежных карточек, указанных в п. 6. Правил, достигшие 18 лет – граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

**7.2.** Участниками Игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, лица, находящиеся с такими лицами в отношениях свойства, а также члены комиссии по проведению Игры.

**8. Условия участия в Игре. Для участия в Игре необходимо:**

**8.1.** в период с 00 часов 00 минут 01.06.2016 г. по 23 часа 59 минут 31.08.2016 г. включительно:

**8.1.1.** совершить 5 (пять) и более из перечисленных ниже безналичных операций с использованием одной из банковских платежных карточек Visa, эмитированных Банками-партнерами Республики Беларусь, следующих видов: Visa Electron, Visa Classic, Visa Gold, Visa Platinum, Visa Infinite, Visa Business and Visa Business Gold:

**8.1.1.1.** по оплате на любую сумму следующих услуг:

- проездных документов (билетов) на междугородние, межрегиональные, международные пассажирские перевозки;

- по размещению и проживанию во время поездки (в том числе за пределами Республики Беларусь);

**8.1.1.2.** по он-лайн оплате за товары/работы/услуги на любую сумму, за исключением операций, указанных в п.8.7 Правил;

**8.1.1.3.** по оплате работ/услуг во время поездки (в том числе за пределами Республики Беларусь) на любую сумму, за исключением операций, указанных в п.8.7 Правил. Безналичная операция будет считаться совершенной в период поездки, если она совершена в населенном пункте, не являющемся местом проживания (постоянной регистрации) и пребывания (временной регистрации) Участника. Место совершения безналичной операции определяется по месту нахождения платежного терминала получателя платежа.

**8.1.2.** изучить Правила и поставить галочку об ознакомлении в регистрационной форме Игры;

**8.1.3.** заполнить регистрационную форму Игры на русском языке на интернет-сайте www.visa.com.by (далее – «Сайт») и зарегистрировать ее в период, согласно периоду регистрации данных для розыгрышей:

- для первого розыгрыша – в период с 00 часов 00 минут 01.06.2016 г. по 23 часа 59 минут 30.06.2016 г. включительно;

- для второго розыгрыша – в период с 00 часов 00 минут 01.07.2016 г. по 23 часа 59 минут 31.07.2016 г. включительно;

- для первого этапа третьего розыгрыша – в период с 00 часов 00 минут 01.08.2016 г. по 23 часа 59 минут 31.08.2016 г. включительно;

- для второго этапа третьего розыгрыша – в период с 00 часов 00 минут 01.06.2016 г. по 23 часа 59 минут 31.08.2016 г. включительно.

**8.1.3.1.** Для заполнения регистрационной формы участнику необходимо заполнить обязательные для заполнения поля регистрационной формы:

- фамилию, имя участника и отчество;

- номер телефона участника в формате – код оператора, номер абонента (пример – 291961716, где 29 – код оператора, а 1961716 – номер абонента, без пробелов и символов);

- адрес электронной почты (e-mail) участника (будет использован Организатором при уведомлении участника о выигрыше);

- данные о каждой из 5 (пяти) безналичных операций:

• дата операции (дата совершения безналичной операции – согласно соответствующему карт-чеку/ выписке банка);

• код авторизации на соответствующем карт-чеке или номер операции для транзакций, совершенных он-лайн;

• банк-эмитент карты (банк, выпустивший соответствующую банковскую платежную карточку);

- код проверки (для подтверждения регистрации).

**8.1.4.** соблюдать нормы законодательства и правил пользования банковскими платежными карточками.

**8.2.** В случае если одно физическое лицо произвело и зарегистрировало более 5 (пяти) безналичных операций (10, 15, 20 и т.п.), соответствующих условиям участия в Рекламной игре, данное физическое лицо фиксируется в качестве Участника игры количество раз, кратное соответствующему количеству регистраций по каждым 5 транзакциям.

**8.3.** Сохранять до выдачи призов оригинал карт-чека безналичной операции, а также для операций по п.8.1.1.1 – оригинал проездного документа (билета) и/ или карт-чека, подтверждающего услуги по размещению и проживанию.

**8.4.** Каждая уникальная регистрация на сайте 5 (пяти) транзакций, соответствующих требованиям настоящих Правил, участвует в розыгрыше призов в порядке, предусмотренном п.10 настоящих Правил.

**8.5.** Регистрация 5 (пяти) новых уникальных безналичных операций осуществляется через заполнение новой регистрационной формы на Сайте.

**8.6.** В случае, если уникальная безналичная операция будет зарегистрирована на Сайте более одного раза, она будет приниматься для участия в розыгрыше только один раз: по факту первой регистрации данных уникальной безналичной операции в регистрационной форме Сайта, и участвовать в розыгрыше на основании такой регистрации (повторная регистрация одного и того же карт-чека не принимается к участию в розыгрыше).

**8.7.** Не могут участвовать в Игре Участники, у которых:

**8.7.1.** не проведена регистрация транзакций на Сайте;

**8.7.2.** зарегистрировано менее 5 разных транзакций на Сайте и/ или имеется дублирование транзакций, в результате которого у Участника фактически остается менее 5 (пяти) зарегистрированных уникальных транзакций;

**8.7.3.** безналичные операции совершены до или после периода, указанного в п.8.1.;

**8.7.4.** зарегистрированы операции по снятию наличных денежных средств или пополнению карт-счета;

**8.7.5.** зарегистрированы операции, совершенные посредством банкоматов и инфокиосков;

**8.7.6.** зарегистрированы операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку.

**9. Состав и размер призового фонда.**

*Таблица 1.*

| № п/п | Наименование призов, участвующих в розыгрыше | Кол-во (шт.) | Сумма за 1 ед. (бел. руб.) | Сумма всего |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Главный приз –** подарочный сертификат на право приобретения комплекса туруслуг (турпродукт) – программу поездки на двоих на Мальдивские острова, которая обязательно включает перелет, размещение в отеле (не менее 4 звезд); питание (минимум – полупансион HB), прочие туристические услуги: медицинское страхование, трансфер (аэропорт – отель – аэропорт) – сроком действия с 01.10.2016 г. по 31.03.2017 г. на сумму 115 000 000 белорусских рублей и денежная сумма в размере 17 035 977 белорусских рублей | 1 | 132 035 977 | 132 035 977 |
| 2 | **Специальные призы:** | | | |
| 2.1. | Подарочный сертификат в кафе «Grand Cafe» на сумму 2 000 000 белорусских рублей сроком действия до 26.10.2016 г. и денежная сумма в размере 150 920 белорусских рублей (далее – «подарочный сертификат») | 21 | 2 150 920 | 45 169 320 |
| 2.2. | Чемодан пластиковый на четырех колесах Желтый Baudet 28* на сумму 1 638 000 белорусских рублей и денежная сумма в размере 96 828 белорусских рублей (далее – «чемодан») | 21 | 1 734 828 | 36 431 388 |
| 2.3. | Велосипед взрослый «Rocco Vierzig» на сумму 6 180 000 белорусских рублей и денежная сумма в размере 775 517 белорусских рублей (далее – «велосипед») | 21 | 6 955 517 | 146 065 857 |

**9.1.** Призовой фонд Игры составляет сумму в размере 359 702 542 (трехсот пятидесяти девяти миллионов семисот двух тысяч пятисот сорока двух) белорусских рублей и формируется за счет денежных средств и имущества Заинтересованного лица (п. 2.3.).

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда.**

**10.1.** Место проведения розыгрышей призов – г. Минск, ул. Ольшевского, 22, пом. 20, ком. 46.

**10.2.** Всего за период проведения Игры Организатором проводится 3 (три) розыгрыша призового фонда:

**10.2.1.** Первый розыгрыш состоится 08.07.2016 г. в 16.00 по безналичным операциям, совершенным и зарегистрированным на Сайте в период с 00 часов 00 минут 01.06.2016 г. по 23 часа 59 минут 30.06.2016 г. включительно. В первом розыгрыше будут разыграны подарочные сертификаты в количестве 21 (двадцати одной) единицы. В ходе розыгрыша Победители будут определяться из числа всех участников, выполнивших Правила Игры, совершивших безналичные операции в период, указанный в настоящем пункте.

**10.2.2.** Второй розыгрыш состоится 08.08.2016 г. в 16.00 по безналичным операциям, совершенным и зарегистрированным на Сайте в период с 00 часов 00 минут 01.07.2016 г. по 23 часа 59 минут 31.07.2016 г. включительно. Во втором розыгрыше будут разыграны чемоданы в количестве 21 (двадцати одной) единицы. В ходе розыгрыша Победители будут определяться из числа всех участников, выполнивших Правила Игры, совершивших безналичные операции в период, указанный в настоящем пункте.

**10.2.3.** Третий розыгрыш состоится 08.09.2016 г. в 15.00 по безналичным операциям и будет проходить в 2 (два) этапа:

